Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцесь!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня
штодзённая газэта

НЯДЗЕЛЯ 19 ЧЭРВЕНЯ 1932 г.
№ 135 (3514)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара . 4-78
Сэктараў 6-15
Пачная рэдакцыя . 12-86 (два званкі)
Выдавецтва . . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымае выключна на пошце і ліставносцямі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радка нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб'ёмам 1 дакумэнту—2р

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ. ПЕРАДАВЫ. ПАЗШ на пярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў.

РЭЙД ПРАВЕРКІ ГАТОЎНАСЬЦІ ДА СЕНАЎБОРАЧНАЙ і СІЛОСНАЙ КАМПАНІЙ.

Узяць з сенажаці два добраякасных укосы (1 стар.).

Сталіца БССР—павінна ўзяць тэмпы Масквы. Менск выканаў 51,5 проц. рэалізацыі пазыкі (1 стар).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ГРУПОРГАЎ. З уступнай прамовы т. ШАРАНГОВІЧА пры адкрыцьці канфэрэнцыі.

З дакладу т. ГУРЭВІЧА (2 стар).

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПАЛІТЭХНІЧНУЮ ШКОЛУ (2 стар.)

Разгортваньнем трусагадоўлі дамо дадатковыя мясныя рэсурсы для рабочага забясьпечаньня (3 стар.).

Чыгуначны транспарт павінен ва ўсе ўзброеньні сустрэць асеньня-зімовыя перавозкі (3 стар.).

Вопыт дэпутацкай групы «ДЫНАМА» усім дэпутацкім групам фабрык і заводаў БССР (3 стар.).

МЕСЯЧНІК ШТУРМУ ПРАРЫВАЎ У ДАРОЖНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ. Ельск паказвае добрыя прыклады (4 стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ.

ПАЗШ напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў

Самы жорсткі крызіс працягвае душыць сваёй мёртвай хваткай эканоміку ПАЗШ. Гордасьць амэрыканскай гаспадаркі—мэталюргія—ЗАГРУЖАНА ЎСЯГО НА 22-25 ПРОЦ. Іншыя галіны гаспадаркі, у тым ліку і аўтамабільная прамысловасьць, знаходзяцца ў яшчэ горшым становішчы.

БЕСПРАЦОЎЕ НЯСУПЫННА РАСЬЦЕ. Нават старшыня рэакцыйнай амэрыканскай фэдэрацыі працы Грын, верны слуга капіталу, прадракае галодныя бунты. Наступ на заработную плату занятых рабочых разгортваецца ў вялізарных разьмерах. Буйнейшыя гарады абанкруціліся і не ў стане выдаваць пэнсію сваім служачым.

Крызіс разьядае арганізм капіталістычнай Амэрыкі. Бандытызм, кантрабанда, вымаганьні, прадажнасьць, подкуп атручваюць усё грамадзкае жыцьцё ПАЗШ. Паасобныя групы фінансавай алігархіі, розныя групы капіталістаў, раскрадаюць вялізарныя дзяржаўныя сродкі ў выглядзе крэдытаў, пошлін, субсыдый.

Але аказваецца, што гэта яшчэ ня ўсё. Амэрыканскай буржуазіі давядзецца выпіць горкую чашу да дна. Вельмі сталая газэта германскай цяжкай прамысловасьці «Дэйчэ Бергерс Цэйтунг» сьцьвярджае, што ФАКТЫЧНА БАНКІРСКІ ДОМ МАРГАНА знаходзіцца ўжо на краю банкрутства. На сусьветных біржах пайшлі чуткі, што справы ў «Нацыональ Сіці Банк» дрэнныя, біржа траціць сваё давер'е да даляра. Ня спыняецца вываз золата. Падае залаты запас фэдэральнага банку. У ПАЗШ усё часьцей гавораць аб неабходнасьці інфляцыі.

Крызіс нізрынуў у прорву банкрутства больш 2-х з паловай тысяч дробных правінцыяльных банкаў. Ён даб'ецца і галоўных магутных цытадэляў фінансавага капіталу, як «Банк Злучаных Штатаў» з асноўным капіталам у 250 мільёнаў даляраў, як «Транс амэрыкэйн корпорэйшэн», які страціў 800 мільёнаў даляраў, як «інсульт кампані», які зьяўляецца адным з буйнейшых дамоў з капіталам у 1,2 мільярды даляраў. Але асабліва вялікае значэньне мае банкрутства «Лі-Хігінсона», аднаго з буйнейшых сусьветных банкірскіх домоў. Банкрутства «Лі-Хігінсона» зьявіцца бязумоўна крыніцай новай панікі ў ПАЗШ і на сусьветных біржах. Бязумоўна нават гувэраўскія крэдыты ня здолеюць «лёкалізаваць» гэты новы пажар.

Растуць падаткі. Але дзяржаўны бюджэт не збалянсаваны, дэфіцыт павялічваецца, бо паглыбляецца крызіс. Дзяржаўны бюджэт ПАЗШ, буйнейшай фінансавай імпэрыялістычнай краіны, якая ўладае амаль палавінаю вытворчых сіл усяго капіталістычнага сьвету, трашчыць па ўсіх швох.

Так званая «адноўная карпарацыя», створаная Гувэрам, дала магчымасьць паасобным прадстаўніком фінансавага капіталу скрасьці з дзяржаўнай касы больш 2 млрд. даляраў для свайго выратаваньня і ўмацаваньня.

У гэтай абстаноўцы глыбачэзнага эканамічнага крызісу адбываецца перадвыбарчая барацьба ў ПАЗШ, пачынаюцца манэўры старых буржуазных партый: рэспубліканскай і дэмакратычнай, разьлічаныя на ашуканства мас.

Супольнымі намогамі абедзьвюх партый буржуазная барацьба «мокрых» і «сухіх»,—барацьба прыхільнікаў адмены закону, якім забараняецца гандаль сьпіртнымі напіткамі і ворагаў гэтай сыстэмы—робіцца амаль не цэнтральнай праблемай перадвыбарчай кампаніі, прычым мноства кантрабандыстаў, спэкулянтаў, бандытаў, якія моцна нажываюцца на гандлі сьпіртам, вядуць занятую барацьбу супроць адмены «сухога» закону, які прынёс ім такія вялікія выгоды. Другая праблема, якая хвалюе буржуазныя галовы, заключаецца ў тым, як лепш арганізаваць у калейшым раскрадзеньне дзяржаўных сродкаў буйнейшымі банкамі і трэстамі пад выглядам барацьбы з крызісам, пад выглядам барацьбы з беспрацоўем.

Рэспубліканцы, на чале з Гувэрам, выстаўляюць перадвыбарчую праграму, якая прадугледжвае: збалянсаваньне бюджэту пры дапамозе зьніжэньня выдаткаў і павышэньня падаткаў; спыненьне выпуску казначэйскіх знакаў; працяг работы «адноўнай карпарацыі», пашырэньне крэдыту фэдэральным банкам; фінансаваньне паасобных прадпрыемстваў; вядзеньне грамадзкіх работ, якія не патрабуюць выпуску новых дзяржаўных пазык; увядзеньне пяцідзённага рабочага тыдню, для дзяржаўных служачых; пашырэньне фондаў для «адноўнай карпарацыі» да 3 млрд. даляраў для правядзеньня работ, «якія даюць даход»—капіталістам, зразумела.

Сутнасьць праграмы Гувэра заключаецца ў тым, што «фэдэральная сыстэма банкаў» і дзяржаўны бюджэт падпадаюць рызыцы, устойлівасьць даляра становіцца пад забарону, але затое буйныя банкі і трэсты атрымліваюць яшчэ 3 млрд. даляраў дапамогі і вялізарныя крэдыты. Усё гэта праводзіцца пад выглядам барацьбы з крызісам і беспрацоўем.

Дэмакраты, як выказваецца «Таймс» «перагувэрылі» самога Гувэра. Яны ўнесьлі законапраект аб тым, каб без адкладна і адразу-ж было выдана яшчэ паўтара мільярда даляраў «адноўнай карпарацыі» для фінансаваньня буйных трэстаў і банкаў, 500 млн. даляраў для грамадзкіх работ і 100 млн. прэзыдэнту для раздачы беспрацоўным.

Кампартыя процідпастаўляе буржуазнай праграме капіталістычнага выхаду з крызісу пралетарскую праграму рэвалюцыйнага выхаду з крызісу, вядучы барацьбу супроць буржуазіі і буржуазнай агентуры ў рабочай клясе і выбарчую кампанію для мабілізацыі і арганізацыі мас супроць дыктатуры буржуазіі і супроць новай імпэрыялістычнай вайны, за дыктатуру пралетарыяту.

Уся перадвыбарчая барацьба ў ПАЗШ адбываецца ва ўмовах шпарка гатаванньня «буржуазнай дэмакратыі» і ў ПАЗШ ў сувязі з гэтым нараджаецца фінансавая плынь ў рамках старых рэакцыйных, шавіністычных і чорнасоценных арганізацый буржуазіі.

Праблемы вонкавай палітыкі амэрыканскага імпэрыялізму адыгрываюць у перадвыбарчай кампаніі параўнальна падначаленую ролю. Фінансавая алігархія, якая ў сапраўднасьці і кіруе палітыкай ПАЗШ, лічыць за лепшае ня выносіць сур'ёзныя пытаньні вайны і міру на шумны перадвыбарчы кірмаш. Між тым, перад імпэрыялізмам даляру стаяць вельмі рэчавыя праблемы.

На Далёкім Усходзе японскі імпэрыялізм паставіў рубам пытаньне аб падзеле Кітаю. Ліст Стымсона да Бора азначае непрыкрытую пагрозу амэрыканскага імпэрыялізму ўзмацніць свае ўзбраеньні. Канцэнтрацыя ваенна-морскага флёту ПАЗШ і яго манэўры ў Ціхім акіяне, пашырэньне і ўмацаваньне паветраных і морскіх баз ПАЗШ на Ціхім акіяне вяшчуе нарастаючую пагрозу вайны, вяшчуе ўзмацненьне японска-амэрыканскіх супярэчнасьцяй.

Гэта не перашкаджае пэўным імпэрыялістычным колам Амэрыкі снабжаць у крэдыт бояпрыпасамі, амуніцыяй, ваенным рыштункам свайго будучага ворага—японскі імпэрыялізм. Гэта палітыка праводзіцца ў сувязі са спробамі ўцягнуць Японію у вайну з СССР у спадзяваньні, што вайна Японіі супроць СССР паслабіць Японію і дасьць магчымасьць амэрыканскаму імпэрыялізму пагрэць свае рукі. У той жа час эканамічны крызіс прывёў да крушэньня пляну Юнга. Рэпарацыйныя плацяжы і тым самым згода аб міжсаюзных даўгох павісьлі ў паветры. Францыя ня спыняе свае атакі супроць залатых запасаў ПАЗШ. Фінансавая алігархія ПАЗШ ахвотна згадзілася-б скараціць ваенныя выдаткі іншых краін, каб паслабіць сваіх канкурэнтаў і забясьпечыць выплату імі сваіх даўгоў. Стымсон, аднак, пакінуў Жэнэву, не дабіўшыся, як вядома, ніякіх рэзультатаў у гэтых адносінах. Таксама забясьпечаны провал Лёзанскай канфэрэнцыі з пункту гледжаньня сапраўднага рашэньня рэпарацыйнага пытаньня.

ПЭЎНАЯ ЧАСТКА БУРЖУАЗНЫХ КОЛАЎ ШУКАЕ ВЫХАДУ З ЦЯЖКАГА СТАНОВІШЧА АМЭРЫКАНСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ ШЛЯХАМ РАСПАЛЬВАНЬНЯ ВАЙНЫ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ—СУПРОЦЬ СССР.

Гэтыя авантурыстычныя спробы крывавых падпальшчыкаў вайны сустрэнуць рашучы адпор з боку шырачэзных мас рабочых і працоўных ПАЗШ.

(Скарочаны перадавы артыкул «Правды»).

Дзесяцігодзьдзе Дзяржбанку СССР
Прывітаньне ад СНК СССР

СНК СССР шле прывітаньне шматтысячнаму калектыву крэдытных работнікаў у сувязі з дзесяцігодзьдзем работы Дзяржаўнага Банку СССР.

Дзяржбанк СССР за 10 год свайго існаваньня адыграў буйнейшую ролю ў стварэньні ўстойлівага грашовага звароту, арганізацыі сацыялістычнага накапленьня, разгортваньні прамысловай вытворчасьці, усяго тавараабароту, кантролю рублём за выкананьнем гаспадарчых плянаў сацыялістычнага будаўніцтва.

СНК СССР выказвае ўпэўненасьць ў тым, што кіраўнікі і работнікі сыстэмы Дзяржбанку забясьпечаць і надалей пасьпяховае вырашэньне пастаўленых перад Дзяржбанкам адказных задач сацыялістычнага будаўніцтва, якое разгортваецца.

Старшыня Савету Народных Камісараў СССР МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Дуброўна выканала фінплян II кварталу на 110%

ЦК КП(б)Б тав. Гікало, Саўнаркому тав. Галадзеду Наркамфіну тав. Хацкевічу газэце „Савецкая Беларусь"

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам Дубровенскага РК КП(б) Дубровенскі гарсавет на 10-е чэрвеня 1932 году фінплян другога кварталу выканаў на 110 проц. Гэтых посьпехаў гарсавет дабіўся, дзякуючы мабілізацыі ўсяго савецкага актыву праз арганізацыю буксірных брыгад, мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. За выкананьне фінансавага пляну ў першым квартале гарсавет атрымаў пераходны сьцяг Дубровенскага Райфа.

Зараз увесь актыў пераключан на рэалізацыю пазыкі 4-га завяршаючага году пяцігодкі, выкінуўшы лёзунг «выканаць плян па падпісцы на працягу дэкады з 10-га па 20-е», пасьля чаго паслаць буксірныя брыгады ў вёскі».

Старшыня гарсавету ЧЭРВЕНЬСКІ.
Старшыня фінсэкцыі КАХАНОЎСКІ.

Плян фізычных укладаньняў выкананы датэрмінова

ПУХАВІЧЫ. 16-6. Пухавіцкая райвыканкамкаса пры непасрэдным кіраўніцтве партыйнай арганізацыі і дапамозе камсамольскай і прафэсіянай арганізацый плян фізычных укладаньняў II вяршэчнага году пяцігодкі, квартялу выканала датэрмінова, на 14 чэрвеня—103 проц.

Райвыканкамкаса пераключылася на ўдарную рэалізацыю пазыкі «4-га завяршаючага году пяцігодкі».

Рэйд праверкі гатоўнасьці да сенаўборачнай і сілоснай кампаніі

УЗЯЦЬ З СЕНАЖАЦІ ДВА ДОБРАЯКАСНЫХ УКОСЫ

Аб сенаўборачнай і сілоснай кампаніі

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і НК РСІ Бел.

Папярэдняя праверка цэнтральных арганізацый паказала зусім слабую падрыхтаванасьць да правядзеньня сенаўборачнай і сілоснай кампаніі на БССР.

Між тым, пасьпяховае правядзеньне гэтых кампаній у бягучым годзе мае выключнае значэньне, у сувязі з тымі задачамі, якія пастаўлены ЦК УСЕ КП(б) і СНК СССР і ЦК КП(б)Б і СНК БССР перад жывёлагадоўчымі саўгасамі і калгасамі па разьвіцьці прадукцыйнай і рабочай жывёлы і разгортваньні калгаснага гандлю.

З прычыны гэтага і на аснове пастановы калегі НК РСІ СССР, прэзыдыум ЦКК КП(б) і Калегія НК РСІ Бел. разам з ЦК ЛКСМБ, рэдакцыямі газэт «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Калгасьнік Беларусі» і НКЗемам Бел. з 19 па 26-VI—г. г. абвяшчаюць масавую рэйд-праверку падрыхтаванасьці саўгасаў, МТС і калгасаў, бедняцкой і сераднякоў аднаасобнікаў да правядзеньня сенаўборачнай і сілоснай кампаніі. У аснову правядзеньня рэйду кладзецца пастанова калегіі НК РСІ СССР, а іменна:

1. Гатоўнасьць і правільнае скарыстаньне трактарнага парку і с.-г. інвэнтару, забясьпечанасьць запаснымі часткамі, нажамі для касілак, косамі, тачкамі і інш. сенакосным інвэнтаром, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, забясьпечанасьць гаручымі і змазачнымі матар'яламі.

2. Гатоўнасьць і правільнае скарыстаньне жывой цягавай сілы і транспарту на сенаўборцы, разьбіўка і прымацаваньне коняй да брыгад, ліквідацыя абязьлічкі па даглядзе за рабочымі конямі, забясьпечанасьць кармамі, збруяй, гэтсаннаглядам.

3. Падрыхтоўка да сілоснай кампаніі, рамонт і падрыхтоўка сілосных збудаваньняў, якія ўжо ёсьць, ход будаўніцтва сілосных збудаваньняў (вежаў, ям, траншэй). Праверка завяршэньня сяўбы сілосных культур, разгортваньне масавага раньняга сіласа вачыня.

4. Арганізацыя працы і кадраў. Арганізацыя брыгад на сенаўборку, прымацаваньне да іх сенажатных вучасткаў, забясьпечанасьць брыгад брыгадзірамі, як арганізатарамі працы рабочых на сенаўборцы (ці праведзена зьдзельшчына, прымацаваньне маёмасьці да рабочых). Пры гэтым неабходна асаблівая праверыць, як саўгасы забясьпечылі сенаўборку рабочай сілай за кошт вярбоўкі ў калгасах.

РайКК РСІ, РК ЛКСМБ і раённы друк абавязваюцца безадкладна пераключыцца ў правядзеньне рэйду, стварыць штабы для апэрацыйнага кіраўніцтва рэйдам, мабілізаваць шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў і камсамолу на фарсаванае скачэньне ўсіх падрыхтоўчых работ, своечасовае і поўнае выкананьне плянаў сенаўборкі і сіласаваньня.

Падагуленыя вынікі правядзеньня рэйду павінны быць даданы ў ЦККК НК РСІ Бел. не пазьней 1-VII г.

Апэрацыйнае кіраўніцтва рэйдам у цэнтры ўскладаецца на кармовы штаб, створаны пры ЦККК і газэце «Зьвязда», у склад якога дадатковa ўвесьці прадстаўнікоў агітмасавага аддзелу ЦК ЛКСМБел.

Прасіць ЦК КП(б)Б вылучыць прадстаўніка для ўдзелу ў рабоце кармовага штабу.

ЦКК НК РСІ Бел. Турлай.
ЦК ЛКСМБел. Смолікава
НКЗБел. Масюкоў.
Газэты: «Зьвязда».
«Савецкая Беларусь»
«Калгасьнік Беларусі».

Тэрміны сканчэньня сенаўборачнай

Зоны	Сканчэньне першага ўкосу запуных, балотных і штучных сенажацяй	Сканчэньне першага ўкосу сухадольных і лясных сенажацяй.	Сканчэньне другога ўкосу сенажацяй.	Сканчэньне ўборкі канюшыны на корм першага ўкосу.	Сканчэньне ўборкі канюшыны другога ўкосу.
Паўднёвая зона .	3-VII	20-VII	20-IX	25-VI	0-VIII
Цэнтральная „ .	10-VII	25-VII	25-IX	30-VI	5-IX
Паўночная „ .	10-VII	30-VII	25-IX	30-VI	5-IX

Увага: Працягласьць першага ўкосу сенажацяй устаноўлена ў 20 дзён, другога ўкосу—15 дзён, першага ўкосу канюшыны—12 дзён, другога ўкосу—12 дзён.

Пачалася ўборка сена

У радзе гаспадарак паўднёвых і цэнтральных раёнаў БССР пачалася ўборка сена. У калгасах Капыльшчыны ўбрана ўжо 12 га канюшыны. Пачалася касавіца ў саўгасе Капацэвічы.

Таксама пачалася ўборка сена па некаторых паўднёвых саўгасах Луг трэсту.

К.



Сьлесар—ударнік Бухараўскага калгасу т. Сьвярыкаў прыстасоўвае буль бакапалку у сенатрасілку.

Аб сенаўборачнай пачалі думаць, калі трэба касіць

Сенаўборачная гэтага году зьяўляецца адзэй з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы. Адсваечасовага і поўнага выкананьня пляну ўборкі сена залежыць пасьпяховае разьвіцьцё і фарсаваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Вопыт мінулай зімы паказаў колькі страт нясе наша дзяржава ад недахопу кармоў з прычыны спазьненьня ўборкі сенажацяй. Але гэта ня ўсе памятаюць. Многія гаспадарчыя арганізацыі і зараз паўтараюць летапнія памылкі. Нарада пры ЦККК НКРСІ, што адбылася 17 чэрвеня, паказала, што ў таліне падрыхтоўкі да сенаўборкі ў нас ёсьць цэлы рад прарываў.

ПАЧЫНАЦЬ КАСЬБУ ЗАРАЗ-ЖА

„Пятроў дзень" не касавіца, а кулацкія забабоны

Партыя і ўрад паставілі перад краінай задачу шырокага разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Пасьпяховае выкананьне праграмы жывёлагадоўлі апроч ажыцьцяўленьня іншых зоа-агратэхнічных фактараў патрабуе стварэньня моцнай кармовай базы, у першую чаргу поўнае забясьпечаньне грубымі кармамі.

З грубых кармоў сена зьяўляецца самым патрэбным кормам,—вось чаму на сенаўборачную кампанію павінна быць зьвернута сур'ёзная ўвага з боку ўсіх партыйных арганізацый, зямельных, гаспадарчых установаў і ўсёй грамадзкасьці.

У БССР павінна быць сёлета ўбрана сена з 1.850.000 га сенажацяй і сеяных траў. Плошча другога ўкосу ўстаноўлена ў 425.000 га. Асноўнай умовай выкананьня пляну сенаўборкі 1932 г. зьяўляецца поўны ахоп сенакашэньнем усіх лугавых плошчаў, своечасовая ўборка і стагаваньне сена, належнае захаваньне і правільнае яго выдаткаваньне. У мінулым годзе быў дапушчаны рад грубых памылак пры правядзеньні сенаўборачнай. З гэтае прычыны ў радзе раёнаў БССР плян сенакашэньня ня быў выкананы ня толькі якасна, але і колькасна. Дырэктыва НКЗему БССР аб раньніх тэрмінах сенакашэньня ня была выканана, з прычыны гэтага знізілася спажыўная вартасьць сабранага сена. Сена атрымалася ў паасобных раёнах грубое, перастаяўшае. У радзе раёнаў сенаўборка зацягнулася да позьняй восені. Вялікі разрыў атрымаўся паміж кашэньнем і стагаваньнем, з прычыны чаго значная колькасьць сена папсавалася.

Сенаўборка гэтага году павінна быць праведзена з улікам і адхіленьнем памылак мінулага году, яна павінна быць высунута як важнейшая народна-гаспадарчая і палітычная задача, якая мае вялікае значэньне ў справе падвядзеньня і стварэньня моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Усе гаспадарчыя арганізацыі, саўгасы і калгасы павінны неадкладна пераключыцца да сенаўборачнай. Трэба цалкам ліквідаваць тэрытарыяльную абязьлічку ў сэнсе скарыстаньня сенажатных плошчаў, якая (абязьлічка) ёсьць у радзе раёнаў, шляхам прымацаваньня іх да непасрэдных карыстальнікаў, трэба спыніць штогоднае пераразьмеркаваньне сенажацяй паміж саўгасамі і калгасамі. Райза і Райкалгасаюзы павінны зараз-жа закончыць адвод сенажацяй кожнай гаспадарцы паасобку і давесьці да іх плян сенаўборкі.

Вельмі ўважліва трэба аднесьціся да пытаньня арганізацыі працы, стваральня сенаўборачных брыгад, замацаваньня вучасткаў, падбору брыгадзіраў, устанаўленьня норм выпрацоўкі, прыцьцяпу зьдзельшчыны, формаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прэм'яваньня і забясьпечаньня патрэбным інвэнтаром.

Сур'ёзная ўвага павінна быць зьвернута на тое, каб сенаўборка была пачата і закончана ў вызначаныя НКЗБ тэрміны. Пачатак сенакашэньня павінен супадаць з момантам поўнага калашэньня большасьці траў у даным травастоі. Касавіцу трэба пачаць фана, не чакаючы «Пятра». «Пятроў дзень» не падыўдзіць да нашай сучаснасьці, гэта ёсьць спадчына дзедаўскіх забабонаў, якая зьядае у нас мільёны пудоў сена. Каб у нас рана пачыналі сенаўборку, нашай жывёле не даводзілася-б пярыдычна галадаць увесну, на трэба было-б падвешваць кароў і коняй на вяроўку, мы-б ня мелі з прычыны бяскорміцы рэзкага зьмяншэньня ўдою, паслабленьня цягавай сілы, а мясцамі і падзяку жывёлы.

Сенаўборачная гэтага году павінна быць праведзена пад лёзунгам 100-процантнага ўцягненьня ў сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўсіх рабочых саўгасаў і калгасьнікаў. Паміж паасобнымі брыгадамі павінны быць заключаны дагаворы сацспаборніцтва за хутчэйшае і лепшае скачэньне ўборкі сена Уся работа па сенаўборцы ў саўгасах, калгасах павінна зьнець па чэснае месца ў насьценных, раённых і цэнтральных газэтах; трэба паказаць работу лепшых брыгад, лепшых брыгадзіраў і ўдарнікаў і вычавіць ад стаючых.

Вялікае значэньне ў справе пасьпяховага правядзеньня ўборкі сена мае добра наладжанае грамадзкае харчаваньне і арганізацыя ясьляў. Кожная гаспадарка павінна неадкладна забясьпечыць усіх рабочых, занятых на сенаўборцы, грамадзкім харчаваньнем. Трэба арганізаваць падвоз на месца работ гарачай стравы, гатаванай вады, чаю. Жаночая праца павінна быць максымальна скарыстана на ўборцы сена, для гэтага ў кожным саўгасе, калгасе павінны быць арганізаваны ясьлі, пляцоўкі.

Усё гэта зьявіцца фактарам пасьпяховага выкананьня пляну сенаўборачнай кампаніі. Посьпех сенаўборкі, гэта посьпех стварэньня моцнай кармовай базы грубых кармоў, посьпех фарсаваньня разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі

С. Тайцэль.

10-ты дзень рэалізацыі пазыкі

Сталіца БССР--павінна ўзяць тэмпы Масквы

Менск выканаў толькі 51,5 проц. заданьня па рэалізацыі пазыкі

Віцеоск павінен паказаць узор бальшавіцкай рэалізацыі пазыкі

ВІЦЕБСК 16-6. Фабрыка «Сьцяг Індустрыялізацыі» дэкрэт ад выпуску новай пазыкі сустрэла разгортваньнем масава-растлумачальнай работы сярод рабочых. Па ўсіх цэхах праведзены сходы, дзе рабочыя ўзялі качкрэтныя самаабавязацельствы падпісацца на пазыку на менш месячнага заработку і скончыць яе ў максымальна-кароткі тэрмін.

Закройны цэх у першы дзень падпіскі даў 21 тыс. руб. Тэхчастка яго ў колькасьці 37 чал. падпісалася на 5200 руб.

Перадавыя рабочыя, падпісваюцца звыш месячнага заработку. Так, напрыклад, Гурэ (закройны цэх) які за рабляе 160 руб., падпісаўся на 200 р., Файерштэйн (закройны цэх) зарабляючы 175 руб., падпісаўся на 200 р. і шмат такіх іншых.

Ударная брыгада мэханіка Гарбунова падпісалася на 1400 руб.

Не адстае ў рэалізацыі падпіскі і ўцюжны цэх, які за кароткі тэрмін аформіў падпіску на 5 тыс. руб. Тэхчастка гэтага цэху падпісалася на 9 тыс. руб.

Вялікую ўвагу ходу падпіскі і кіраўніцтва ёю ўдзяляе рэдакцыя шматтыражкі, якая штодзённа выпускае бюлетэнь. Рабкоры-ударнікі зьяўляюцца ня толькі ініцыятарамі падпіскі, але і самі даюць добрыя прыклады. Рэдкалегія штодзённкі 9—10 груп падпісалася на 110 проц. месячнага заработку, а рабкорка Сталіцкая, якая атрымлівае 102 руб. у месяц, падпісалася на 150 руб.

Як недахоп, трэба адзначыць тое, што ў некаторых цэхах (пінжачны) работа па падпісцы на пазыку распачалі са значным спазьненьнем. Слаба пастаўлена растлумачэньне сутнасьці новай пазыкі. Як вынік гэтага—цэх зьяўляецца адстаючым.

Фабрыка «Прафінтэрн» узмоцнена разгортвае падпіску на пазыку. 10 і 11 чэрвеня па ўсіх цэхах праведзены мітынгі аб значэньні пазыкі. Партыкалектыў, фабком і камсамольскі калектыў абвясьцілі конкурс за лепшы цэх і зьмену.

Уся работа праходзіць пад знакам барацьбы за захаваньне пераходнага сьцягу гарпрафсавету. На фабрыцы ўжо ёсьць больш 1000 падпісчыкаў на месячны заработак. Упарадзе ўдарна рэалізуючых пазыку ідуць ватны цэх і тэхчастка. 239 рабочых гэтага цэху падпісаліся на месячны заработак і 20 чал. падпісалася на 5-тыднёвы заработак. 14 чэрвеня ватны цэх у асноўным завяршыў падпіску.

На пасьпяховае разьмяшчэньне новай пазыкі мабілізаваны ўвесь актыў Шчацінна-шчотачнага камбінату. Па цэхах пры ўдзеле сатаварыскай чырвонаармейскай часьці праведзены масавыя мітынгі рабочых, прысьвечаныя выпуску новай пазыкі. Па ўсіх цэхах вылучаны апэрацыйныя тройкі, якія адказваюць за правядзеньне падпіскі. Перадавымі зьяўляецца брыгада імя Кагановіча, брыгадзірам якой зьяўляецца тав. Іёфэ, і брыгада імя IX зьезду прафсаюзаў, з брыгадзірам Фін клерам.

Першым на камбінаце па рэалізацыі пазыкі ідзе кутасавязальны цэх, які ахапіў ўсіх рабочых цэху падпіскай. Ганебна адстае валасяны цэх, у якім падпіска дасягнула ня больш 15 проц. У гэты цэх вылучана буксірная брыгада.

Але, маючы гэтыя посьпехі нельга не паказаць адстаючых: на фабрыцы імя КІМ партколектыў і фабрычныя арганізацыі праяўляюць недастатковую напорыстасьць у разьмяшчэньні новай пазыкі. На некаторых цэхах, дзе не праводзіцца дастатковай масава-растлумачальнай работы, падпіска на пазыку праходзіць нездавальняюча.

Побач з брыгадамі Журавінкавай і Рыбаковай, рабочыя якой падпісаліся на 110 проц. месячнага заработку і ўдарнікамі падпіскі па пазыку, як Зайцавай і Бараноўскай ёсьць такія брыгады, як брыгада Мартанка, Вяргун і Буевіч, якія на 12 чэрвеня ня мелі яшчэ ніводнага падпісчыка на пазыку

Гэты факт з усёй красамоўнасьцю сьведчыць аб зусім недастатковай работе партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі фабрыкі імя КІМ у разгортваньні падпіскі на пазыку. Марудныя тэмпы падпіскі на фабрыцы ставяць яе ў лік кандыдатаў на атрыманьне рагожнага сьцягу. Гэтага партарганізацыя фабрыкі і рабочая грамадзкасьць не павінны дапусьціць.

Язэп Чорны.

Койданава--Райкому, РВК, Райпрафсавету, Гарсавету

Шчыра вітаю працоўных гораду Койданава, якія ўдарнымі тэмпамі першымі ў БССР перавыканалі заданьне рэалізацыі пазыкі чацьвертага завяршаючага на гораде.

Жадаю Койданаўскаму кіраўніцтву такіх-жа посьпехаў рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў і працоўных сялян-аднаасобнікаў.

ХАЦКЕВІЧ

РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ ПРАВОДЗЯЦЬ БАЛЬШАВІЦКІМІ МЭТАДАМІ

Лагойск. Выпуск новай пазыкі працоўныя Лагойшчыны сустрэлі з вялікім энтузіязмам. Рэалізацыя пазыкі праводзіцца мэтадамі бальшавіцкай работы—ударніцтвам і сацспаборніцтвам.

Рабочыя і служачыя друкарні і рэдакцыі «Чырвоная Лагойшчына» падпісаліся на 1100 руб. і выклікалі на сацспаборніцтва саўгас «Луцаўшчына» і калгас «Бальшавік».

Работнікі саюзу Мэдсанпрацы падпісаліся на месячную зарплату і выклікаюць на сацспаборніцтва саюз Працасьветы.

Нарада старшынь сельсавета поўнасьцю падпісалася на пазыку ў разьмеры месячнага заработку і выклікала на сацспаборніцтва саюзы, МТС і батрацтва, дзяржустановы і фінбанкаўскіх работнікаў. (Белта).

У калгасе „8-га сакавіка" шырока разгарнулася падпіска на пазыку

СЛУЦАК. Калгасьнікі калгасу «8-га сакавіка», Палікарпаўскага сельсавету, шырока разгарнулі падпіску на пазыку чацьвертага заключнага. Кожны калгасьнік падпісаўся на суму 20-25 руб. і тут жа ўносіў па 5-10 руб. У выніку на сходзе сабрана 227.

На першым-жа сходзе, прысьвечаным выпуску пазыкі, 10 калгасьнікаў калгасу «Будзёны», таго-ж сельсавету, падпісаліся на 20 руб. кожны. Частка грошай унесена тут-жа на сходзе. Падпіска на пазыку па гэтых і астатніх калгасах раёну працягваецца.

Жодзінскі сельсавет за ўдарную работу па мабілізацыі сродкаў прэм'яваны

Калегія Народнага Камісарыяту БССР разглядзела рапарт Жодзінскага сельсавету, Смалявіцкага раёну, аб датэрміновым перавыкананьні пляну другога кварталу мабілізацыі сродкаў.

Калегія пастанавіла адзначыць пасьпяховую работу Жодзінскага сельсавету, які выканаў да 10 чэрвеня плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 116 проц., і выдаць яму грамату НКФ БССР і 150 руб. для прэм'яваньня актывістаў па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Б.

Зводка

ходу рэалізацыі пазыкі па БССР на 16 чэрвеня 1932 г. у тысяч. руб.

Раёны	Кантрольн. заданьне	Сума падпіскі	Проц. выкананьня	Раёны	Кантрольн. заданьне	Сума падпіскі	Проц. выкананьня
Койданаўскі . .	210	202	96,2	Крычаўскі . . .	424	102	24,1
Гомельскі . . .	6022	4152	68,9	Рагачоўскі . . .	440	100	22,7
Тураўскі . . .	70	39	55,7	Ельскі	190	41	21,6
Клімавіцкі . . .	410	213	52,0	Чашніцкі . . .	226	43	19,0
Барысаўскі . . .	1630	800	49,1	Касьцюковіцкі . .	285	44	15,4
Жыткавіцкі . . .	84	40	47,6	Глускі	321	48	15,0
Чырв.-Слабодзкі .	81	37	45,6	Чэрвенскі . . .	310	48	15,5
Мсьціслаўскі . .	213	97	45,5	Церахаўскі . . .	170	25	14,7
Менскі	10600	5465	51,5	Крупскі	218	41	18,8
Любанскі . . .	147	62	42,2	Лоеўскі	103	16	15,5
Старобінскі . . .	87	35

„Зьвязаць партыйна-масавую работу з усей сумай мерапрыемстваў, якія праводзяцца на заводзе" (Кагановіч)

З уступнай прамовы т. ШАРАНГОВІЧА пры адкрыцьці канфэрэнцыі*)

15 чэрвеня пачала сваю работу 1-я Усебеларуская канфэрэнцыя группарторгаў.

Канфэрэнцыю адкрыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч, які ў сваёй уступнай прамове сказаў:

— У мэтах дэтальнага вывучэньня і абагульненьня вопыту перабудовы партыйчай і масавай работы, у мэтах перанясеньня ўзорчых прыкладаў яе ў адстаючыя зьвеньні партыйных арганізацый на мясцох — ЦК КП(б)Б парашыў склікаць даную канфэрэнцыю. Ёй мы надаем выключна важнае значэньне.

Задачы, якія стаць перад партыйнымі арганізацыямі па ўзьнаўленьні на вышэйшую ступень партыйнай і масавай работы, выразна акрэслены ў прамове тав. Кагановіча на апошнім пленуме МГК УсеКП(б), у пастанове ЦК УсеКП(б) ад 21-III 1931 г. і адпаведных рашэньнях ЦК КП(б)Б..

Наша партыя, пад кіраўніцтвам свайго ЦК на чале з тав. Сталіным, дабілася вялізарных посьпехаў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі ёсьць рэзультат пасьпяховага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, якое праходзіла ў бязьлітаснай барацьбе на два фронты — супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэньцтва да іх.

Кожны дзень прыносіць нам весткі аб пуску ўсё новых і новых гігантаў сацыялістычнай прамысловасьці, аб новых дасягненьнях у сельскай гаспадарцы на аснове яе сацыялістычнай рэканструкцыі. Але мы ня былі-б большавікі, калі-б супакоіліся на дасягнутых посьпехах. Улічваючы невычарпальныя магчымасьці краіны Саветаў, ўсё ўзрастаючы творчы нтуізм шырокіх працоўных мас, XVII партканфэрэнцыя, на аснове дасягнутых перамог, паставіла задачу сусьветна-гістарычнага значэньня — пабудаваць у другім пяцігодзьдзі бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе ад нас аддаваць выключную ўвагу справе сацыялістычнага перавыхаваньня працоўных мас, вызначэньня новых форм і мэтадаў работы і кіраўніцтва рабочай клясай мільённымі масамі калгасьчыкаў і працоўных аднаасобнікаў. За апошні час значна вырасла рабочая кляса, пераварылася ў шмат мільённую армію пралетараў, значная частка якой ня ведае капіталістычнага прадпрыемства. Значна вырасла палітычная актыўнасьць і запатрабаваньні шырокіх працоўных мас.

Гэта вымагае ад партыйных арганізацый — «кіраваць і працаваць па-новаму», перабудаваць сваю работу так, каб цэнтр яе цяжару быў перанесены ў нізавое вытворчае зьвяно, каб на кожным вучастку вытворчасьці была забясьпечана авангардная роля камуністаў. Кожны член і кандыдат партыі павінен быць узорным на вытворчасьці, павінен весьці за сабой масы на барацьбу за ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна, на барацьбу за пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

У прамове тав. Кагановіча дана выразная ацэнка становішча перабудовы партыйнай і масавай работы па Маскоўскай арганізацыі. Гэта ацэнка амаль поўнасьцю можа быць ужыта і ў адносінах да нашых вытворчых парт арганізацый. Перад канфэрэнцыяй группарторгаў стаіць задача ўскрыць недахопы, якія яшчэ маюць месца ў перабудове партыйнай работы на нашых прадпрыемствах і на аснове вывучэньня лепшага вопыту забясьпечыць шырокае разгортваньне масава-выхаваўчай работы ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці. Абгаварэньне кожнага пытаньня на канфэрэнцыі павінна праходзіць пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, вызначэньня такіх форм і мэтадаў работы, якія далі-б нам магчымасьць у самы кароткі тэрмін завяршыць перабудову партыйна-масавай работы.

Далей тав. Шаранговіч характарызуе становішча, якое мы маем у справе ажыцьцяўленьня 6-ці пістарычных умоў тав. Сталіна. Побач з узорнымі прыкладамі работы ў гэтым напрамку, у радзе нашых арганізацый падыходзяць да пытаньня кіраўніцтва вытворчым жыцьцём прадпрыемства, саўгасу або калгасу фармальна. Яшчэ не ва ўсіх арганізацыях навучыліся канкрэтна і апэрацыйна кіраваць вытворчасьцю.

У заключэньне тав. Шаранговіч вызначае канкрэтныя задачы, якія стаяць перад партыйнымі арганізацыямі на мясцох па растлумачэньні і папуляризацыі сярод шырокіх працоўных мас апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК аб збожжа і мясазагатоўках, аб калгасным гандлі.

На шляху сацыялістычнага будаўніцтва,—гаворыць тав. Шаранговіч,—ёсьць рад труднасьцяй. Гэтыя труднасьці росту партарганізацыі на мясцох не павінны скрываць ад працоўных мас, а простай, зразумелай для іх мовай, растлумачыць прычыны ўзьнікненьня гэтых труднасьцяй, мабілізаваць рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на іх перамаганьне.

У разгортваньні масава-растлумачальнай работы рашучую ролю адыграе нізавое зьвяно партыйнай арганізацыі.

Тыя задачы, якія стаяць перад намі ў справе ўзмацненьня партыйнай групы, цэхавай і зьвеньневай ячэйкі пры дапамозе канфэрэнцыі бязумоўна будуць ажыцьцёўлены.

Тав. Шаранговіч абвяшчае канфэрэнцыю адкрытай, пасьля чаго выбіраецца прэзыдыум і сакратарыят канфэрэнцыі.

З дакладам аб стачовішчы і задачах партыйнай і масавай работы выступіў тав. Гурэвіч.

У канцы вячэрняга паседжаньня 15 чэрвеня і на ранішнім паседжаньні 16 чэрвеня канфэрэнцыя заслухала даклад тав. Кавалёва аб ролі і задачах гаспадарча-разрахункових брыгад і выкананьні прамфінпляну. ў 1932 годзе.

Пасьля дакладу тав. Кавалёва з ра партамі аб рабоце груп выступілі лепшыя группарторгі буйнейшых прадпрыемстваў Беларусі: т. т. **Бярковіч** (Гомсельмаш), **Бараноўская** (акулярная фабрыка), **Левіт** («Бальшавік»), **Бацьвінік** («Кастрычнік»), **Багданаў** і **Савэльзон.**

На вячэрнім паседжаньні 16 чэрвеня адбываліся спрэчкі па дакладах т. Гурэвіча і Кавалёва. У спэчках прынялі ўдзел партыйныя работнікі буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР.

З вялікай прамовай аб задачах перабудовы партыйнай і разгортваньні масава-выхаваўчай работы, спатканы бурнымі воплескамі на канфэрэнцыі, выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

Канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы тав. **Сталіну, МГК УсеКП(б)** — тав. **Кагановічу і ЦО УсеКП(б) — «Правде».**

У заключэньне канфэрэнцыя аднагалосна прыняла рэзалюцыю — праграму работы прамысловых і транспартных партарганізацый па перабудове партыйнай і масавай работы.

*) Даецца па жывой запісі з газэты «Зьвязда».

Аб становішчы работы і задачах нізавога партыйнага зьвяна ў прамысловасьці і на транспарце

(З дакладу нам. заг. аргінстру ЦК КП(б) тав. Л. ГУРЭВІЧА)

У сваёй прамове на пленуме Маскоўскага гарадзкога камітэту партыі тав. **Кагановіч** даў разгорнутую праграму партыйна-масавай і агітацыйна-выхаваўчай работы на фабрыках, заводах, транспарце, у саўгасах, калгасах і МТС, а таксама сярод працоўных аднаасобнікаў.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага камітэту па чале з тав. Сталіным, у барацьбе з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі, наша партыя дабілася надзвычай вялікіх посьпехаў на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва СССР і ў тым ліку Савецкая Беларусь маюць нябывалыя дасягненьні ў разьвіцьці як прамысловасьці, транспарту, так і сельскай гаспадаркі—будаўніцтве саўгасаў, калгасаў і МТС.

Гэтыя дерахог на шляху да пабудовы сацыялізму выклікалі значны рост рабочай клясы, рост яе палітычнай актыўнасьці, рост актыўнасьці шырокіх калгасных мас і працоўных аднаасобнікаў. Разам з ростам палітычнай актыўнасьці мы маем рост іх запатрабаваньняў. Усё гэта вымагае ад кожнага камуніста, ад кожнай нізавой партарганізацыі максымальнай увагі да разгортваньня выхаваўчай і растлумачальнай работы, быць у авангардзе працоўных мас тораду і вёскі, весьці іх на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя задачы партыйных арганізацый могуць быць ажыцьцёўлены толькі на аснове перабудовы ўсёй партыйна-масавай работы ў адпаведнасьці з лёзунгам тав. Сталіна—«па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць».

Мы маем магчымасьці ў гэтым напрамку выкарыстаць багацейшы вопыт Маскоўскай, Ленінградзкай і інш. перадавых партыйных арганізацый. У сваёй штодзённай рабоце кожнай партыйнай арганізацыі трэба кіравацца указаньнямі тав. Сталіна, апошнім выступленьнем тав. Кагановіча аб пастаноўцы партыйнай і масавай работы.

Перад намі стаіць адказная і неадкладная задача — дабіцца рашучага павароту ў бок палепшаньня, узьняцця на больш высокую ступень арганізацыйнай, партыйна - выхаваўчай і масавай работы ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці. Гэта зьяўляецца рашаючай умовай пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі, належнай сустрэчы пяцігодзьдзя пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Асноўнай задачай кожнай ячэйкі і парткалектыву, а таксама—гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі зьяўляецца ўзмацненьне нізавога і сярэдняга партыйнага зьвяна—цэхавай ячэйкі і партыйнай групы, дзе канцэнтруецца цэнтр цяжару партыйнай і масавай работы. Аднак, на мясцох патрэбнай работы ў гэтым напрамку яшчэ не адчуваецца.

— Чым займаюцца многія арг. аддз. у нашых таркомах і райкомах?

Яны засядаюць і выносяць рэзалюцыі, усталяюць і г. д. А пытаньнямі партыйнай работы ў цэху і брыгадзе яны ў лепшым выпадку займаюцца толькі перад раённымі партыйнымі кач фэрэнцыямі, перад выбарамі кіруючых органаў ячэек. Нажаль, такое зьявішча мы маем у радзе буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР.

Габінэтная работа арг. аддзелаў у раёнах прыводзіць да таго, што яны ня ведаюць канкрэтных умоў работы партыйных арганізацый на прадпрыемствах, ня ведаюць тых людзей, якімі яны кіруюць і якім даручана кіраваць партыйнымі арганізацыямі на мясцох.

Вось чаму канфэрэнцыя павінна з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне аб тым, каб арг. аддзел райкому або гаркому большую частку сваёй работы праводзіў непасрэдна ў нізавых партыйных зьвеньнях, дапамагаў ім у іх штодзённай рабоце.

Наша канфэрэнцыя павінна быць аглядам таго, як мы змагаемся за ажыцьцяўленьне 6-ці умоў тав. Сталіна. У далейшым мы павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на вывучэньне лепшага вопыту, на максымальнае яго скарыстаньне, на разгортваньне сацыялістычнай узаемадапамогі паміж асобнымі групамі, ячэйкамі і калектывамі.

Тав. Кагановіч у сваім апошнім выступленьні паставіў перад намі актуальнейшую задачу — **узмацніць сярэдняе зьвяно нашых вытворчых партарганізацый — цэхавую і зьменную ячэйку** з тым, каб яны маглі апэрацыйна і канкрэтна кіраваць і дапамагаць партарганізатару ў яго штодзённай рабоце. Між тым, я не памылюся, калі скажу, што вы—кіраўнікі партыйных груп маеце ўсе падставы для таго, каб паскардзіцца на дрэнную якасьць кіраўніцтва і дапамогі ў гэтай рабоце з боку цэхавых і зьменных ячэек.

Наша задача — **ахапіць партыйна-масавай выхаваўчай работай кожнага маладога камуніста, кожнага рабочага на прадпрыемстве.**

Некаторыя таварышы, сярод іх, нажаль, ёсьць і адказныя работнікі нашых прадпрыемстваў, пытаюць—чым урэшце павінна займацца партыйная група — партыйная работай ці прамфінпляном?»

Ужо такая пастаноўка пытаньня сьведчыць аб неразуменьні гэтымі таварышамі таго, што іменна шляхам добрай пастаноўкі партыйнай і масавай работы мы можам забясьпечыць пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў. Аб гэтым надзвычай выразна сказаў тав. Кагановіч.

«У сучасны момант ячэйка павінна цэнтральны ўпор зрабіць на партыйна-масавай рабоце. Гэта і будзе тым самым забясьпечаньнем выкананьня прамфінпляну. Для гэтага трэба перабудаваць работу ячэек...

«... Трэба па-бальшавіцку арганізаваць усю партыйную работу, каб апора была на сярэднія зьвенні і на іх партыйных арганізатараў, як асноўных дапаможнікаў парткому, якія ахапляюць усю масу рабочых, якія арганізуюць ня на барацьбу за прамфінплян, за снабжэньне, за культуру, за школу і г. д.».

Мы ня можам не адзначыць таго, што ў партыйнай арганізацыі БССР ёсьць ня мала такіх партыйных груп, якія працуюць ня дрэнна. Возьмем для прыкладу **партыйную групу тав. Бярковіча** — брыгада кавальнага цэху Гомсельмашу. Гэта брыгада да арганізацыі ў ёй партыйнай групы сыстэматычна ня выконвала сваёй вытворчай праграмы. Пасьля-ж арганізацыі групы ў брыгадзе наступіў рэзкі пералом у бок павышэньня як колькасных, так і якасных паказальнікаў. Ужо ў студзе ні брыгада выкачала свой прамфінплян на 122 проц. і ў далейшым процант выкананьня пляну ў брыгадзе ня бывае менш чым за 105 проц.

Добрым прыкладам можа служыць таксама **партыйная група т. Амбразевіча** на заводзе імя Варашылава, якая арганізавалася яшчэ ў чэрвені мінулага году. Кожнае пытаньне, якое зьвязана з вытворчым жыцьцём брыгады, абгаварваецца і прапрацоўваецца яе трыкутнікам, а потым выносіцца на абмеркаваньне групы і брыгады. Кожны дзень у брыгадзе праводзяцца дзесяці хвілінныя вытворчыя нарады. Усе камуністы групы ахоплены партыйнай вучобай, пераважная большасьць рабочых брыгады таксама наведвае школы партыйнай сеткі і выпісвае газэты. Значная работа праведзена партыйнай групай у справе разгортваньня інтэрнацыянальнага выхаваньня. Ёю заключана сацыялістычная ўмова з Лейпцыгскай камсамольскай арганізацыяй, з якой рэгулярна перапіска. Ня меншая ўвага аддаецца і пытаньням абарончай работы, у выніку чаго ў брыгадзе ёсьць некалькі снайпэраў.

Ня дрэнныя паказальнікі ў перабудове партыйнай і масавай работы набыты і на іншых прадпрыемствах БССР. Да рэчы, трэба адзначыць, цікавы мэтад масавай работы, які ўжываецца на **Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце.** Там рад партыйных груп ужываюць у сваіх вытворчых зьвеньнях таварыскія суды, што дае надзвычай вялікі выхаваўчы эфэкт у стварэньні грамадзкай думкі вакол зрыўшчыкаў прамфінпляну.

Бязумоўна, ня трэба думаць, што гэтыя партыйныя групы не павінны заглядваць гэтых посьпехаў і дабівацца ўдасканаленьня перабудовы сваёй работы.

Адваротны малюнак мы маем на тых прадпрыемствах, дзе да пытаньня перабудовы партыйнай і масавай работы падыйшлі фармальна. На гэтых прадпрыемствах ёсьць ня мала так званых «мёртвых» партыйных груп. На **заводзе «Камунар»** на запытаньне ў аднаго камуніста, якія ён выконвае партыйныя нагрузкі, ён адказаў: «зборчых членскіх узносаў». І толькі пасьля суфлёрскай рэплікі сакратара ячэйкі ён дадаў: «праўда, я яшчэ парторг». Такі абураючы факт зьявіўся ў рэзультаце таго, што партыйныя кіраўнікі «Камунара», ня гледзячы на выразныя ўказаньні ЦК КП(б)Б, не зварочвалі ўвагі на партыйных арганізатараў. На заводзе былі такія выпадкі, калі работнікі парткалектыву і цэхавых ячэек забывалі сказаць камуністу аб тым, што ён вылучаны партыйным арганізатарам.

У сувязі з гэтым я хачу спыніцца на **некаторых арганізацыйных пытаньнях. Як правіла, партыйная група** на вінна абслугоўваць адну вытворчую брыгаду з лікам ня больш чым 25—30 рабочых. Праўда, можна дапускаць і абслугоўваньне групай 2-х вытворчых брыгад, прычым з аднолькавымі тэхналёгічнымі працэсамі. Між тым, у нас ёсьць выпадкі, калі партыйныя групы ў 5—7 камуністаў абслугоўваюць такія вытворчыя адзінкі, дзе налічваецца каля 200 чалавек рабочых. У гэткіх ўмовах, зразумела, партыйная група ня можа ўзьняць сваёй работы на належную вышыню.

Неабходна закрануць таксама пытаньне аб тым, у якіх брыгадах можа быць створана партыйная група. У пазяжэньні ЦК КП(б)Б аб арганізацыі нізавых партыйных зьвеньняў на вытворчасьці гаворыцца, про «партгрупа арганізуецца пры наяўнасьці на даным вытворчым вучастку ня менш 3-х камуністаў». Гэта азначае, што нават пры наяўнасьці аднаго члена партыі і двух кандыдатаў можа быць арганізавана партыйная група. Другая справа, калі ў брыгадзе ёсьць толькі кандыдаты партыі.

Некалькі слоў аб **зьмесьце працы** нашых партыйных груп. Асноўнай задачай кожнага партыйнага зьвяна зьяўляецца мабілізацыя рабочых мас на пасьпяховае выкананьне колькасных і якасных паказьнікаў прамфінпляну. Трэба толькі, каб барацьба за прамфінпляну ў практыцы партыйнай групы не падмяняла сабою работы адміністрацыйных і прафсаюзных органаў. **Задача партыйнай групы—узьнімаючы кожнае зьвяшчэ ў жыцьці брыгады на палітычна-прынцыповую вышыню, ствараць вакол яго адпаведную грамадзкую думку.**

Група павінна штодзённа вывучаць рабочых сваёй брыгады і змагацца з адсталымі настроямі, якія прынесены на завод варожым элемэнтам, з настроямі, якія носяць дробна-буржуазны, а ў радзе выпадкаў клясава-варожы характар. Прычым, гэта барацьба павінна асноўвацца на ўзмацненьні агітацыі, прапаганды, на шырока разгорнутай выхаваўчай рабоце.

Асобна трэба адзначыць тыя задачы якія стаяць перад нашымі вытворчымі партарганізацыямі і асабліва перад іхнізавымі зьвеньнямі ў справе **марксыцка-ленінскага выхаваньня новых папаўненьняў партыі.** Мы павінны прызнаць, што рабоце сярэдкандыдата ў партыі ў нас аддаецца вельмі мала ўвагі. Ёсьць выпадкі, калі партыйная група праводзіць вялікую работу сярод ударнікаў сваёй брыгады дзеля таго, каб забясьпечыць уступленьне іх у партыю. А тады, калі той ці іншы беспартыйны рабочы стане кандыдатам у члены КП(б)Б, партыйная група аб ім забывае, часта яму даюцца непасільныя нагрузкі.

У рэзультаце такіх недапушчальных адносін да работы сярод кандыдатаў, на радзе нашых прадпрыемстваў некаторыя з іх маюць пратэрмінаваны кандыдацкі стаж. Напрыклад, у **Магілёўскай** арганізацыі, сярод рабочых—кандыдатаў партыі ёсьць 9 асоб са стажам з 1929 г. і 9 чалавек з 1930 г. Яшчэ горш справа стаіць у **Віцебскай** арганізацыі, дзе ёсьць кандыдаты партыі з 5-гадовым стажам. Зусім нездавальняюча стаіць справа і з ахопам новых папаўненьняў партыйнай вучобай.

Адным з важных умоў добрай работы партыйнай групы зьяўляецца **правільна пастаўленае плянаваньне і ўлік.** У радзе ячэек можна наглядаць тэндэнцыі складаньня плянаў для партыйных груп ня менш, як на 3 месяцы. Бязумоўна, такое плянаваньне можа паслужыць толькі тормазам у рабоце. Партыйная група павінна **мець канкрэтны апэрацыйны план ня больш, як на адну дэкаду,** у якім падрабязна вызначаюцца пэрсанальныя абавязкі кожнага камуніста і тэрмін выкананьня кожнага даручэньня. Трэба, каб партыйныя групы на сваіх сходах не загружалі дзесяткамі пытаньняў парадку дня, зьбіраліся часьцей і праводзілі-б 10—15 хвілінныя сходы па адным—двух найбольш важных пытаньнях.

Ня менш важнай ўмовай пасьпяховай работы прадпрыемства зьяўляецца правільная расстаноўка партыйных сіл. Мы маем цэлы рад фактаў, калі вядучыя вучасткі вытворчасьці на прадпрыемстве не забясьпечаны партыйным уплывам. На швэйнай фабрыцы ў Магілёве ёсьць брыгады, у якіх налічваецца па 6—7 камуністаў, а ў некаторых брыгадах няма і аднаго члена або кандыдата партыі. У такіх выпадках партарганізацыя ў поўным кантакце з адміністрацыяй павінна выправіць падобныя недахопы ў расстаноўцы сіл.

Тыя адказныя задачы, якія стаяць перад партыйнай групай, могуць быць вырашаны ў тым выпадку, калі будзе намі зьвернута належная ўвага на **ўзмацненьне цэхавых і зьменных ячэек, на камплектаваньне іх моцнымі партыйнымі работнікамі, калі адказныя работнікі партыйнага калектыву будуць працаваць не ў габінэце, а ў цэху і брыгадзе, разам з кіраўнікамі цэхавай ячэйкі практычна дапамагаць партарганізатарам.**

Можна быць упэўненым, што на аснове разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі канфэрэнцыя вызначыць лепшы вопыт нашай работы і тыя асноўныя недахопы, якія ў ёй маюць месца, а таксама намецціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па заавершэньні перабудовы партыйнай работы, па ажыцьцяўленьні дырэктыў ЦК і ўказаньняў тав. Сталіна, што забясьпечыць належную сустрэчу нашымі прадпрыемствамі другой пяцігодкі.

Канкрэтнае кіраўніцтва дало добрыя вынікі

Гомель. Гомсельмаш.

У аснову работы нашай партгрупы пакладзены 6 умоў тав. Сталіна. Замест 49 чал. паводле пляну ў брыгадзе працуе зараз 39, якія ня толькі выконваюць, але і перавыконваюць прамфінплян.

У барацьбе з цякучасьцю рабочай сілы мы правялі работу па замацаваньні рабочых, і 30 чал. замацавалі сябе на канца 5-годкі.

Мы першыя па заводзе ўвялі індывідуальнае сацпаборніцтва шляхам заключэньня індывідуальных сац. умоў паміж кожным рабочым і перадалі свой вопыт на астатніх цэхах.

Усе 12 чал. камуністы- ударнікі вядуць за сабою астатнюю масу беспартыйных рабочых.

Ужо 6 месяцаў як брыгаду перавялі на гаспадарчы разьлік; вынікі наступныя: калі раней прамфінплян выконваўся на 87-90 проц., дык зараз прамфінпляч выконваем на 110—118 проц., брак давялі да 0,1 проц., сабекошт на 1 проц. ніжэй вызначанага паводле пляну, прагулы зьнізіліся да 0,5 проц., штомесячна маем эканомію на 80-100 руб. у брыгадзе.

Па брыгадзе існуе плянава-апэрацыйная зводка, якая штодня правярае паказьчікі па выкананьні прамфінпляну на кожнага рабочага пасобку і своячасова новы прамфінплян даводзіць да кожнага рабочага.

Адным з галоўнейшых вучасткаў работы партгрупы зьяўлялася ўцягненьне лепшых вытрыманых рабочых ударнікаў у рады партыі. У выніку мы маем рост за студзень—2 чал., люты—2 чал., сакавік—1 чал., красавік—7 чал.

У рабоце партгрупы друк зьяўляецца верчым памочнікам партыі ў разгортваньні крытыкі і самакрытыкі, выкананьні прамфінпляну, зьнижэньні браку і ў барацьбе з прагуламі.

Друк штодзённа асьвятляе недахопы і дае далейшы напрамак у рабоце.

Масавая работа брыгады праводзіцца штодзённа ў час абедзевых перапынкаў і пасьля работы па пытаньнях: рашэньні IX зьезду прафсаюзаў, апошнія пастановы партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках, аб калгасным гандлі. Праводзяцца чыткі газэт аб міжнародным становішчы і г. д.

Усе гэтыя дасягненьні ёсьць вынік правільнага апэрацыйнага кіраўніцтва нізавым партыйным з боку парткалектыву заводу.

Собаль.

Узмацніць партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам

Заслаўшчына. Значную ролю ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі павінен адыгрываць нізавы друк—насьценгазэта, штодзёнка. Аднак у Рогаўскім сельсавеце справа абстаіць зусім ня так. Нізавы друк там не зьяўляецца змагаром за пасьпяховае выкананьне трэцяй бальшавіцкай сяўбы і наогул за ўсе тыя мерапрыемствы, якія праводзіць партыя і савецкая ўлада. Гэта зьяўляецца простым вынікам таго, што нізавым друкам тут ня кіруе ні партыйная, ні камсамольская ячэйкі.

У калгасе «Полымя» ёсьць 13 вытворча-палявых брыгад, з якіх толькі ў 6-ці выпускаюцца штодзёнкі. Калі возьмем самае ядро калгасу—брыгаду № 1, дык тут да гэтага часу яшчэ няма штодзёнкі, а выпускаць ёсьць каму. Тут ёсьць ШКМ, дзе ёсьць камсамольская ячэйка, настаўнік і наогул шмат актыву. Актыў разам з настаўнікам зусім бязьдзейнічае па гэтай галіне.

Ня лепш абстаіць справа і ў Рогаўскай ШКМ, дзе ад пачатку навучальнага году выпушчана толькі 9 нумераў насьценгазэты. Часта ў газэтах, якія выпускаюцца ёсьць палітычныя памылкі. Нарады старшыні рэдкалегій зусім не праводзяцца.

У Рогаўскай ШКМ мелі месца факты заціску самакрытыкі з боку некаторых настаўнікаў (Дагурэвіч) і сакратара камсамольскай ячэйкі (Грышук). Калі селькоры Вітушка і Дзем'яновіч напісалі допіс пра Дагурэвіча, дык апошні патрабаваў, каб допіс яму паказалі, калі селькора допісу яму не паказалі, Дагурэвіч падаў скаргу ў ячэйку ЛКСМБ. Сакратар ячэйкі за гэта Вітушку даў пагарджаньне, а Дзем'яновічу вымову.

Ня кіруе сваімі селькорамі і раённая газэта «Камунар Заслаўшчыны». Рэдакцыя газэты нават не адказвае селькорам на допісы, якія прысылаюцца імі.

Партыйчай і камсамольскай ячэйцы патрэбна ўзяць належнае кіраўніцтва над нізавым друкам, каб апошні сапраўды зьяўляўся вострай зброяй партыі.

Ал. Д.

Работа партгрупы на фабрыцы „Пралетарская Перамога"

Партгрупа фабрыкі «Пралетарская Перамога» (Барысаў) ахапляе 4 брыгады з лікам рабочых 135 Членаў КП(б)Б—4, кандыдатаў—5.

Кожны камуніст мае тую або іншую галіну работы. Вылучан і член партыі, які сочыць за якасьцю прадукцыі. Праверка даручаемай работы праходзіць праз справаздачы на партгрупе.

За час сваёй работы партгрупа вырасла на 3 чалавекі. Прыём у партыю праводзіўся праз практычную работу ў брыгадзе і праз даручэньне асобных заданьняў і нагрузак беспартыйным. На праведзеных сходах ставіліся пытаньні аб якасьці прадукцыі, аб парт. і тэх. вучобе, аб падрыхтоўцы да ўсебеларускай канфэрэнцыі партгруп і г. д.

Усе партыйцы займаюцца вучобай, з якіх 4 у кандыдацкай школе, 1 у камвузе, 2 у рабфаку і 1 у школе рабочай моладзі.

Партгрупа змагалася за сыстэматычнае перавыкананьне прамфінпляну, дзякуючы чаму ёсьць наступныя вынікі: за май месяц 1-я брыгада выканала прамфінплян на 105 проц., 2-я—100 проц., 3-я 103 проц. і 4-я—96 пр.

У цэху канчаткова ліквідавана абязьлічка і ўраўнілаўка. Існуе індывідуальная зьдзелыпчына ў брыгадах.

Паміж брыгадамі заключаны сац. умовы, якія сыстэматычна правяраюцца. Адным з лепшых памочнікаў партгрупы ў рабоце зьяўляецца цэхавы друк. У часе абедзевых перапынкаў членамі партыі праводзяцца гутаркі сярод рабочых, аднак такая важная работа, як чытка газэт, партгрупай зусім забыта.

Жук.

Усебеларускі конкурс на лепшую палітэхнічную школу

У барацьбе за палітэхнічную школу

20-ая Менская ФЗС

У 1931-32 навучальным годзе Менская 20-ая ФЗС паставіла сваёй задачай барацьбу за якасьць вучэбна-выхаваўчай работы, за пераход на вышэйшую ступень палітэхнізацыі. Спаткаўшы з энтузіязмам пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе і мабілізаваўшы сябе на ўдарнае выкананьне пастановы, школа шырока папулярызавала гэту пастанову, як сярод пэдагогаў, вучняў так і сярод бацькоў і рабочых заводу. У барацьбе за рэалізацыю пастановы ЦК, школа ў першую чаргу зьвярнула ўвагу на ліквідацыю «карэннага недахопу». Вылучыўшы лепшых сваіх работнікаў у брыгады НКА БССР па складаньні праграм, школа ўсім калектывам і кожным пасобку пэдагогам стала рыхтавацца да пераходу на новыя праграмы. Прааналізаваўшы гэтыя праграмы, школа сплянавала сваю работу і да канца года дасягнула значных вынікаў у галіне ліквідацыі «карэннага недахопу». Выпіска з вывадаў брыгады Гаркому КП(б)Б аб гэтым гаворыць так: «У барацьбе за рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе, 20-ая ФЗС дабілася значных посьпехаў у галіне ліквідацыі «карэннага недахопу». Якасьць ведаў вучняў па ўсёй школе здавальняючая».

Як-жа школа дабілася гэтых посьпехаў? Яна дабілася іх тым, што кожны пэдагог, кожны вучань ведаў, што яму рабіць; школа зьліквідавала абязьлічку, работу пабудавала і праводзіла на аснове шасьці гістарычных указаньняў т. Сталіна. Кожным пэдагогам праграмы былі разьбіты на разьдзелы і тэмы, складзены пляны кожнага дню заняткаў, кожнай дэкады і паўгодзьдзя. Пэдагогі рыхтаваліся да лекцый, арганізоўвалі дзетвару, вялі работу з адстаючымі, мабілізавалі ўвагу вучняў да вучобы, увёўшы рэжым дню школьніка і раз грузіўшы яго ад лішняй работы.

Адначасова быў зроблен і ўпор на пастаноўку палітэхнічнай працы ў школе. Аб канкрэтных мерапрыемствах у гэтых адносінах гаворыць наступная выпіска з вывадаў абсьледваньня школы брыгадай ЦКК РСІ БССР ад 3 лістапада 1931 г.:

«Канкрэтныя мерапрыемствы па палітэхнізацыі школы вызначаны ў вытворчым пляне школы. Галоўныя мерапрыемствы наступныя:

Разгортваньне прышкольнай майстэрні для вучняў старэйшых груп (5—7) на 18 сталярных варштатаў, 20 месц каля ціскоў, 2-х такарных станкоў (па мэталю і дрэве), сьвідравальнага станка, круглай пілы, 2-х электраматораў і г. д. Майстэрня разгорнута на 80 проц.

Арганізацыя рабочага пакою для вучняў малодшага канцэнтру, дзе праца праводзіцца настаўнікам - група водам.

Разгортваньне вытворчага палітэхнічнага навучаньня на машынабудаўнічым заводзе імя Варашылава, у цэхах—ліцейным, мэханічным, зборачным, кавальскім і загатоўчым і ў хімічнай лябараторыі.

Пры школе арганізуецца электратэхнічная лябараторыя-майстэрня.

Тэарэтычныя заняткі па асобных дысцыплінах цесна ўвязваюцца з вытворчым палітэхнічным навучаньнем.

Заняткі ў малодшым канцэнтры зьвязаны з экскурсіямі на завод, жыцьцё і праца якога прасякае вучэбна-выхаваўчую работу ў школе».

«У справе правядзеньня палітэхнізацыі, школа, па думцы брыгады, узяла належны напрамак». І далей

У заключэньне брыгада кажа: «20-ая ФЗС знаходзіцца на належным правільным шляху да палітэхнізацыі, як у галіне ідэалёгічна-мэтадычнага кіраўніцтва, так і ў галіне матар'яльнага (параўнаўча з іншымі школамі). Але неабходна яшчэ мабілізацыя ўвагі ўсяго настаўніцтва на ўвязку тэорыі з практыкай праз дакладнае вывучэньне палітэхнічнага профілю заводу імя Варашылава, вызначэньне там адпаведных рабочых месц для вучняў і ўключэньне ў вытворчае навучаньне, падпарадкоўчы яго праграмна-навучальным і выхаваўчым мэтам. Неабходна паскорыць тэмпы ў дазбсталяваньні мэханічнай часткі майстэрні пры школе, каб поўнасьцю ахапіць палітэхнічнай працай вучняў старэйшага канцэнтру».

Гэтыя пажаданьні брыгады школаю выкананы. Але школа лічыць, што тое абсталяваньне, якое ёсьць, далёка недастатковае. Праўда, такіх майстэрань, такіх габінэтаў, ня маюць іншыя школы гораду Менску, але школа лічыць, што яна ў адносінах абсталяваньня зрабіла толькі першыя крокі.

Большасьць настаўнікаў школы, з досьць вялікім стажам і пэдагагічным вопытам прайшоўшы пад кіраўніцтвам інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу заводу вытворча-палітэхнічную практыку, вядуць шырокую работу па абслугоўваньні настаўнікаў прыгарадных і гарадзкіх школ.

20-ая ФЗС уключылася ва Ўсебеларускі конкурс на лепшую школу. Налічваючы 92 проц. арганізаваных дзяцей (камсамольцаў 16, піянэраў 274 і акцябрат 248), школа шырока разгарнула барацьбу за першае месца ў конкурсе. Падлічыўшы свае дасягненьні ў галіне ліквідацыі «карэннага недахопу», грамадзка-карысную работу, вучнёўскае самакіраваньне пазна ў ўдарную барацьбу з прапускамі, спазьненьнямі і парушэньнямі дысцыпліны. У выніку гэтай барацьбы сьвядомая працоўная дысцыпліна сярод вучняў узьнялася і выпадкі парушэньня дысцыпліны к канцу навучальнага году ня месца ў сьценах школы.

Школа ў парадку сацспаборніцтва вядзе інтэрнацыянальную работу з 8-й яўрэйскай школай. І ў гэтай галіне, як і ў галіне антырэлігійнага, ваеннага і фізкультурнага выхаваньня школа мае значныя дасягненьні. На працягу году школа не зафіксавала аніводнага выпадку антысэмітызму ці шавінізму, паміж тым, як нацыянальны склад школы досыць стракаты: у ёй вучацца беларусы, яўрэі, палякі, рускія і інш.

Побач з дасягненьнямі 20-я школа мае і недахопы. Дзеці да канца году атрымлівалі з разьмеркавальніка МЦРК дрэнныя абеды. Толькі з наступнага навучальнага году школа зможа перайсьці на гатаваньне яды ў кухні і сталоўцы, якія зараз рамантуюцца пры школе.

Ня менш важным недахопам зьяўляецца ў апошні час і няўважлівыя адносіны да школы з боку кіраўніцтва заводу Варашылава,

РАЗГОРТВАНЬНЕМТРУСАГАДОУЛІ

дамо дадатковыя мясныя рэсурсы для рабочага забясьпечаньня

Яшчэ няма сур'ёзных адносін да трусагадоўлі

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Бабруйскія арганізацыі яўна ігнаруюць дырэктывы партыі і ўраду аб разгортваньні трусагадоўлі. Ня гледзячы на тое, што кожнай арганізацыі гораду дано канкрэтнае заданьне па арганізацыі трусатнікаў, амаль ніводная з арганізацый ня прыступіла да сапраўднай работы па стварэньні трусагадоўчых гаспадарак.

Такія арганізацыі, як **Эльвод**, завод **«Чырвоны Харчавік»**, завод імя **Вараншылава**, завод імя **Сталіна** да гэтага часу аб арганізацыі трусатнікаў нават і не падумалі.

Ёсьць рад прадпрыемстваў, якія арганізоўваюць трусатнікі чарапашыным тэмпамі. Так, фабрыка імя Халтурына набыла... 2 трусы, замест 50, Керамічны трэст... 4 трусы, замест 125 Такса ма бязьдзейнічаюць сельскагаспадарчы камбінат. Лесрабкоп і ЗГК швэйні каў, якія нічога не рабілі ў разгортваньні трусагадоўлі.

Па-ўдарнаму ўзяўся за разгортвань не трусагадоўлі саюз паляўнічых. Пры задачыні ў 150 трусоў, на сёньняшні дзень саюз паляўнічых ужо мае 209 і праводзіць далейшую работу па пашырэньні трусатніка, па стварэньні моцнай трусагадоўчай гаспадаркі.

З прычыны адсутнасьці сродкаў, будаўніцтва агульнагарадзкога трусаматачніку пры с.-г. камбінаце для пашырэньня гарадзкіх трусатнікаў знаходзіцца пад пагрозай зрыву..

Па такім бюракратычным ігнараваньні дырэктывы партыі ў галіне палепшаньня забясьпечаньня рабочага гораду трэба бязьлітасна ўдарыць. Цьвёрдалобыя гаспадарнікі і іншыя носьбіты «ідэй» аб немэтазгоднасьці і бескарысьнасьці пашырэньня трусагадоўлі павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Плян будаўніцтва трусагадоўчых гаспадарак павінен быць выкананы. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на арганізацыю цэнтральнага трусаматачніку пры сельскагаспадарчым камбінаце, які адыграе вялікую ролю ў далейшым пашырэньні трусагадоўлі.

А. Дамброўскі.

Ня хочуць займацца „дробязьзю"

РАГАЧЭЎ. Трусагадоўля, як магутная крыніца ў вырашэньні мясной праблемы, па Рагачэўшчыне недаацэньваецца. Паводле пляну сельспажыўтаварыстваў раёну павінны загатовіць 300 трусаматак, гарспажыўтаварыствы 50. Апрача таго, пры кожнай сталоўцы было намечана арганізаваць трусатнік ня менш, чым на 10 трусаматак.

Але работы па набыцьці і гадоўлі трусоў райспажыўсаюз не вядзе. Ён наогул ня хоча займацца гэтай «дробязьзю». Фактычна ніводнае сельспажыўтаварыства не арганізавала ў сябе трусатніку. Пры гарадзкой сталоўцы ёсьць толькі... два трусы, якія дрэн на даглядаюцца.

На фабрыцы імя **Сталіна** пытаньнем гадоўлі трусоў не жадаюць займацца ні сталоўка, ні прафарганізацыя. Набытыя 4 трусы знаходзяцца на падстрэшшы ў кватэры дырэктара фабрыкі. За ім ніхто не даглядае. Да пабудовы трусатніку фабрычная прафарганізацыя і сталоўка ня думаюць прыступаць.

Неабходна разьбіць апартуністычную недаацэнку разьвіцьця трусагадоўлі з боку гарспажыўскіх арганізацый.

(Белта).

Кармленьне крадьчат у вопытна-паказацельным крадьчатніку. (Харкаў).

Да 1-га жніўня даць 400 трусоў

Каапхарч чыгуначнага вузлу **ст. Вораша** за апошні час актыўна ўзяўся за мабілізацыю ўнутраных харчовых рэсурсаў за забясьпечаньне мясам сталовак для харчаваньня рабочых-чыгуначнікаў.

За месячны тэрмін па пяці сталоўках чыгункі ўжо налічваецца каля 70 трусоў. Пры сталоўцы № 13 рабочых цягі ёсьць 46 трусоў, якія знаходзяцца ў спэцыяльна пабудаваных і прыстасаваных для гэтага клетках.

Таксама прыступіла да разьвядзеньня трусоў сталоўка № 1, якая ўжо налічвае сем трусоў. Трусы знаходзяцца ў досыць спрыяльных умовах.

Гэты пачатак каапхарчу і загадчыкаў пасобных сталовак павінен быць пашырэны.

Праўленьню Аршанскага каапхарчу неабходна ажыцьцявіць намечаныя мерапрыемствы па разгортваньні трусагадоўлі пры асобных сталоўках.

Даць да першага жніўня 1932 г. 400 трусоў,—баявая задача Аршанскага каапхарчу, якую ён павінен выканаць і перавыканаць.

М. Гурвіч.

ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ

павінен ва ўсеўзброеньні сустрэць асеньня-зімовыя перавозкі

На барацьбу за здаровы паравозі вагон

Сыйшло ўжо больш палоны летняга пэрыяду, які павінен быў быць скарыстаны для падрыхтоўкі да асеньне-зімовых перавозак. Ва ўсіх зьвеньнях чыгуначнага транспарту ўжо павінна быць быць разгорнута бальшавіцкая работа да сустрэчы магутных грузапатокаў восені і зімы.

Аднак, на гэтым важнейшым вучастку работы на чыгуначных вузлох БССР наглядаецца поўная сьпячка, поўная недаацэнка гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы.

Нарком шляхоў зносін тав. Андрэеў у сваіх загадах патрабаваў ад усіх гаспадарнікаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый чыгуначнага транспарту давесьці карысную работу паравозаў да 11 гадзін у суткі, і вагонаў да 8,5 гадзін, неадкладна наладзіць спэцыяльны рамонт паравознага парку, павесьці далейшую барацьбу за зьніжэньне ліку хворых паравозаў і вагонаў, павялічыць сярэдняя-сутачны прабег і г. д.

Як жа гэты важнейшы загад наркома праводзіцца ў жыцьцё чыгуначнымі арганізацыямі БССР?

Трэба з усёй яснасьцю сказаць, што чыгуначныя раёны БССР на выкананьні норм карыснай работы паравозаў і вагонаў, па спэцыяльным рамонце і сустрэчным пляваваньні вельмі адстаюць.

Праз спэцрамонт у Гомельскім дэпо з 15 красавіка па 1 чэрвеня г. г. павінна было прайсьці 18 паравозаў. Гэта заданьне з надворнага боку як-бы выканана, (адрамантавана 20), але якасьць рамонту не адпавядае тым запатрабаваньням, якія высуноў у сваім загадзе тав. Андрэеў. Напрыклад, конкурсны паравоз ОЖ—4631, прайшоўшы спэцыяльны рамонт у Гомельскім дэпо, з 9 мая па 26 чэрвеня меў 13 запісаў рамонту. Тое-ж самае здарылася і з паравозам ОВ—4806. Гэтыя агідныя факты недобраякаснага рамонту сьведчаць аб тым, што трыкутнік Гомельскага дэпо не ўсьвядоміў вялікіх задач, не мабілізаваў рабочую масу чыгуначнікаў на аздараўленьне паравознага парку, на выкананьне загаду наркома.

Мы маем такія агідныя зьявішчы, калі цягнікі накіроўваюцца не па спэцыялізацыі. Асаблива гэта наглядаецца па Віцебскім, Асіпавіцкім, Гомельскім і Калінкавіцкім вузлох. Гэтыя зьявішчы ня толькі не памяншаюцца, а, наадварот, маюць тэндэнцыю росту.

Ясна, што, партыйныя арганізацыі, мясцкомы не разгарнулі належнай масава-палітычнай работы сярод рабочых мас чыгуначнікаў вакол задач пастаўленых у сваім загадзе НКШЗ, не ўзьнялі хвалю самапаборніцтва і ўдарніцтва не падрыхтаваліся да паравозак асеньня-зімовага пэрыяду.

Зараз задача заключаецца ў тым, каб нябавячы ніводнай хвіліны разгарнуць бальшавіцкую ўдарную падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак, разгарнуць масавую самаправерку выкананьня пасьці ўмоў тав. Сталіна, павесьці рашучую барацьбу за поўнае іх ажыцьцяўленьне.

Рашуча перамагаючы перашкоды апартуністаў, чыноўнікаў і бюракратаў, чыгуначны транспарт БССР павінен выканаць заданьні партыі і ўраду аб асеньня-зімовых перавозках і гэтым самым садзейнічаць пасьпяховаму выкананьню ўсяго народна-гаспадарчага пляну заключнага году пяцігодкі.

Рыхтуемся да асеньня-зімовых перав озак.



Спэцыяльны рамонт таварнага паравозу.

Даць 8,5 гадзін карыснай работы вагона ў суткі

Нарком шляхоў зносін т. Андрэеў у сваім загадзе прапанаваў давесьці карысна-сутачную работу вагона да 8,5 гадз. Каб выканаць гэты загад, трэба павесьці чоткую работу па ўсіх зьвеньнях, з якімі сутыкаецца работа вагона.

Значную частку вагон прастойвае пад нагрузачна-выгрузачнымі апэрацыямі, а таксама ў чаканьні падачы пад нагрузку, выгрузку і ўборку грузных вагонаў. На гэтыя апэрацыі трапіцца амаль $^2/_3$ усяго сутачнага часу вагона. Мы, праўда, дамагліся таго, што вагон пад нагрузачна-выгрузачнымі апэрацыямі прастойвае менш паказанага тэрміну для даных работ (станцыі Н.-Беліца, Гомель, Карукаўка і інш.), але ўсё-ж справа з падачай вагонаў станцыі вельмі дрэнна. Толькі за дзьве дэкады на станцыі Рэчыца складзены акт, неабвержны станцыяй аб прастоі вагонаў і рабочай сілы, аб прагуле грузчыкаў на суму 1622 рублі, складзены акты па ст. ст. Гомель, Н.-Беліца, Дземяхі і па радзе іншых станцый.

Трэба ўзяць кантроль над выкананьнем намечаных аддзелам эксплёатацыі мерапрыемстваў па загадзе наркома тав. Андрэева, што дасьць магчымасьць палепшыць работу па падачы і ўборцы рухавога складу і выканаць загад наркома аб даведзеньні карысной работы вагона ў суткі да 8,5 гадзін.

Д. Жываў.

Ад кліентуры многае залежыць

Загад Наркому пра асеньня-зімовыя перавозкі асабліва падкрэсьліў неабходнасьць забясьпечаньня дастаўкі ў пункты завозу ўсіх грузаў, якія могуць быць завезены ў летні час, каб на восень не перашкаджаць пасьпяховаму разгортваньню перавозачнай кампаніі і максымальнаму скарыстаньню рэальных магчымасьцяй чыгуначнага транспарту.

Мінулагодняя практыка паказвае, што гэтае папярэджаньне тав. Андрэева мае для чыгунак Беларусі вялізарнейшае значэньне. Даволі падаць той факт, што ў сьнежні і студзені—самыя напружаныя месцы—чыгункі Беларусі заняты былі перавозкай дроў, якія можна было-б перавезьці задоўга да восені. Гэты факт паказаў, як нерацыянальна скарыстоўвае кліентура транспартныя сродкі, як яна няпытка, як недакладна плянуе сваю работу.

Сёлета трэба абмічуць такія выпадкі, сёлета трэба мець самую падрабязную дамоўленасьць з кліентурай, жорсткі плян скарыстаньня рухомага складу. Патрэбны нарады з кліентурай.

Але гэта ня вычэрпвае пытаньня. Гэта—паўмера. Пытаньне будзе вырашана толькі ў межах дачага раёну. Але на раённых нарадах нельга ўлічыць транзіту праз пасобныя раёны, узаемадзейнічаньня гэтых раёнаў, нельга складці дакладны генэральны плян работы кліентуры.

Патрэбна нарада з ахопам усёй Беларусі. Яе павінен правесьці раённы камітэт па перавозках (Смаленск), склікаўшы прадстаўнікоў усіх чыгуначных раённых кіраўніцтваў і кліентуры. З гэтага трэба пачынаць, разьвярстаўшы потым па пасобных раёнах намёткі агульнага пляну, намеціўшы дакладны кантакт іх. Аднак раённы камітэт праяўляе маруднасьць. У раёнах не адчуваецца яго кіраўніцтва, клопатаў аб падрыхтоўцы да адказнейшай кампаніі. У раёны не паступіла ніводнай дырэктывы з раённага камітэту па перавозках, ніводнай намёткі аб памерах работы. Раённыя кіраўніцтвы выпрацоўваюць свае пляны, выходзячы толькі з агульнай устаноўкі загаду Наркому аб тым, што перавозкі сёлета будуць на 30 проц. большыя за леташнія. Вядома, што патрэбна дэталізацыя. Вядома, што патрэбна канкрэтызацыя асобных папярэдніх пунктаў (мы лічым, што канчатковымі гэтыя пляны быць ня могуць) намёткі.

Упаўнаважанаму НКШЗ пры СНК СССР неабходна падштурхнуць няпыткі раённы камітэт па перавозках, прымусіць яго ўзяцца за чоткае плянаваньне перавозак.

Н.

Пра ход злучнай кампаніі

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Адзначаючы, што ня гледзячы на тое, што злучная кампанія 1932 г. павінна быць такой-жа важнай і ўдарнай кампаніяй як пасеўная і ўборчая, гэтае важнейшае гаспадарча-палітычнае мерапрыемства не пастаўлена ў цэнтры ўвагі цэнтральных і раённых арганізацый і праводзіцца зусім нездавальняюча.

Зямельныя, калгасныя і саўгасныя ўстановы і арганізацыі не разгарнулі баявой апэрацыйнай работы па арганізацыі злучнай кампаніі і не забясьпечылі належнага кіраўніцтва і кантролю за ходам яе.

Асабліва нездавальняюча праходзіць злучная кампанія ў Бялынічскім, Дубровенскім, Крупскім, Сеньненскім, Чашніцкім, Быхаўскім, Будакашалёўскім, Кармянскім, Клімавіцкім, Койданаўскім, Плешчаніцкім, Старадарожскім, Брагінскім, Жыткавіцкім, Мазырскім, Парыцкім, Рэчыцкім, Тураўскім, Бабруйскім і Віцебскім раёнах, якія нават не падалі Народнаму Камісарыяту Земляроства пляну і справаздач аб арганізацыі і ходзе злучнай кампаніі.

Ня гледзячы на тое, што дапамога саўгасаў, калгасных таварных фэрм і калгасаў калгасьнікам і аднаасобнікам у арганізацыі і правядзеньні злучнай кампаніі мае вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне, толькі некаторыя раёны як: Касьцюковіцкі, Шклоўскі, Гураўскі, Пухавіцкі і Бягомльскі разгарнулі работу па арганізацыі злучных пунктаў для абслугоўваньня неаграмаджанага статку калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць саўгастрэсты, Белкалгасцэнтр і яго спэцыяльныя цэнтры і раённыя выканаўчыя камітэты дабіцца рашучага пералому ў правядзеньні злучнай кампаніі і забясьпечыць ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па поўным і своечасовым сканчэньні вясновай злучкі ў саўгасах, таварных калгасных фэрмах, калгасах, у малочных і сьвінагадоўчых гаспадарках спажывецкай кааперацыі і ў неаграмаджаным статку калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

2. Указаць дырэктарам Малочнапрамысловага трэсту тав. Сьмірнову, Сьвінаводтрэсту тав. Аўчыньнікаву, Сьвінаводкалгассаюзу тав. Красоўскаму, Мясамалакокалгасцэнтру т. Грыневічу і старшыням Бялынічкага, Дубровенскага, Крупскага, Сеньненскага, Чашніцкага, Будакашалёўскага, Кармянскага, Клімавіцкага, Койданаўскага, Плешчаніцкага, Старадарожскага, Брагінскага, Жыткавіцкага, Мазырскага, Парыцкага, Рэчыцкага, Тураўскага, Бабруйскага і Віцебскага раённых выканаўчых камітэтаў на абсалютна нездавальняючае апэрацыйнае кіраваньне злучнай кампаніяй.

3. Ухваліць мерапрыемствы Народнага Камісарыяту Земляробства аб правядзеньні 2-х месячніку злучнай кампаніі і барацьбы за поўнае захаваньне маладняка і абавязаць усе гаспадарчыя арганізацыі і раённыя выканаўчыя камітэты забясьпечыць у час 2-х месячніку мабілізацыю максымальнай увагі да злучнай кампаніі рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

4. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты:

а) кожную пяцідзёнку выслухоўваць даклады сельскагаспадарчых арганізацый і сельскіх саветаў аб ходзе злучнай кампаніі і работы па захаваньні маладняка;

б) прыцягваць да адказнасьці асоб, вінаватых у зрыве злучнай кампаніі і работы па захаваньні маладняка;

в) праверыць, як на мясцох выкананы дырэктывы Белкалгасцэнтру аб выплаце сьвінарам звыш выпрацаваных на фэрме працадзён па 1 руб. за кожную пакрытую сьвінаматку і калі выявіцца, што гэтая выплата ня зроблена, забясьпечыць неадкладны разьлік.

5. Абавязаць упаўнаважаных ЦК і СНК па веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі, побач з забясьпечаньнем кіраваньнем і кантролем ходу заканчэньня сяўбы, у бліжэйшыя дні зьвярнуць асаблівую ўвагу на праверку і дапамогу мясцовым арганізацыям у правядзеньні злучнай кампаніі.

6. Прапанаваць усім арганізацыям і раённым выканаўчым камітэтам спыніць скарыстаньне вытворнікаў не па прызначэньні (раз'езды на жарабцох і г. д.) і папярэдзіць, што пры выяўленьні такіх выпадкаў вінаватыя ў гэтым будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

7. Абавязаць саўгастрэсты, пад адказнасьць іх дырэктароў, загадчыкаў калгасных таварных фэрм і старшынь раённых калгассаюзаў, а таксама раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы належным чынам паставіць улік ходу злучнай кампаніі і забясьпечыць своечасовую і наладжаную справаздачу Народнаму Камісарыяту Земляробства.

8. На адным з чарговых пасяджэньняў выслухаць даклады Белкалгасцэнтру, яго спэцыяльных цэнтраў і саўгастрэстаў аб ходзе злучнай кампаніі і рабоце па захаваньні маладняка.

9. Лічыць неабходным, каб цэнтральны і раённы друк забясьпечыў найбольш поўнае асьвятленьне ходу злучнай кампаніі і работы па захаваньні маладняка.

Нам. Старшыні СНК і Эканамічнага Савету БССР А. КАЛНІН.
Кіраўнік Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.
14 чэрвеня 1932 г.
№ 124 г. Менск.

Ударна скончыць сяўбу кораньплодаў у прыгарадных гаспадарках

Сілы і сродкі пераключыць на паполку

Сводка

аб ходзе сяўбы ў прыгарадных гаспадарках Белагродмалжыўкаапгасу БКС на 10 чэрвеня 1932 г.

Назва гаралоў	Гародніна культуры		Палявыя культуры, разам з канюшнай	
	Плян у га	Проц. выкананьня	Плян у га	Проц. выкананьня
Менск	1173	64	1444	91,5
Віцебск	1066	41	2020	56
Гомель	783	61	1688	66
Магілеў	627	49	1703	86,5
Барысаў	438	41	565	112,5
Бабруйск	777	59	1381	80
Рэчыца	829	48	1188	53,7
Полацак	260	54	801	38
Мазыр	219	102	626	54,7
Ворша	538	90	1138	97,5
Шклоў	123	41	431	40
Жлобін	205	79	290	95
Усяго	6538	58,5	13276	75
Пасевы ЗРК, ЗВК, ТПО і РСС	—	264 га	—	1201,5 га
Разам	6538	64	13276	84

ЧАС ПАЛОЦЬ, А СЯЎБА ЯШЧЭ НЯ СКОНЧАНА

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Ня гледзячы на тое, што ўвесь час прыгарадныя гаспадаркі Віцебску знаходзяцца ў глыбокім тыле, толькі зараз пачалася пасыла ка рабочых брыгад з прадпрыемстваў у каапгасы. За апошнюю пяцідзёнку каапгасы ня толькі не дабіліся ўзрастаньня тэмпаў сяўбы, але нават наглядаецца значнае зьніжэньне іх. Апошняя пяцідзёнка дала прыросту усяго 4 проц.

Найбольш ганебнае адставаньне ў каапгасе **«Новы шлях»**, які выкачаў плян на 26 проц., Церасполь—29 пр. «Новы сьвет»—32 проц.

Каапгас **«Парыская Камуна»** адным з першых сярод прыгарадных гаспадарак скончыў сяўбу, аднак, плян спэцыялізацыі гэтым каапгасам ня выкананы. Каапгас да гэтага часу не надрыхтаваў глебу для пасадкі кораньплодаў, нават ня вывезены гной. У той час, калі часеньня гуркоў ёсьць на складах спажыўсаюзу ў дастатковай колькасьці, каапгас сарваў плян засеву гуркоў, матыруючы адсутнасьцю насеньня.

Плачы спэцыялізацыі прыгарадных гаспадарак знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. Так, каапгас імя «МОПР'у», якому патрэбна засеяць 57 га гародніны, з гэтай плошчы засеяў толькі 12 га, а астатнюю заняў пад зярнёвыя культуры. Аналёгічнае становішча і ў каапгасе «Парыская камуна», дзе замест 100 га раньняй бульбы засеяна толькі 50 га. На лепш справа абстаіць са спэцыялізацыяй і ў каапгасе **Білева-Янопаль.**

Згодна дырэктывы гаркому партыі ў прыгарадныя гаспадаркі павінны пасылацца штодзенна рабочыя брыгады. Напрыклад, у калгасе **«Новы сьвет»** павінна працаваць штодзенна 300 членаў саюзу, а ў сярэднім працуе толькі 55—60 чалавек, якія накіроўваюцца ўсяго толькі 2 саюзамі: нархарчу і трамвайнага дэпо. 9-га чэрвеня акулярная фабрыка павінна была накіраваць ў каапгас «Новы сьвет» 500 чал., але на работу зьявілася 150 чалавек.

Гэтыя факты, якія з усёй красамоўнасьцю паказваюць аб нядбайных адносінах фабрычных арганізацый да правядзеньня сяўбы ў прыгарадных гаспадарках, ня прымусілі яшчэ гарпрафсавет рашуча паставіць пытаньне перад прафарганізацыямі прадпрыемстваў аб сыстэматычнай пасылцы рабочых ў прыгарадныя гаспадаркі. Арганізацыі фабрык **«Сьцяг індустрыялізацыі»** і **«Прафінтэрн»** вынесьлі ня мала пастаноў аб дапамозе свайму каапгасу **«Новы шлях»**, але далей гэтага не пайшлі. Практычнай работы гаспадарка ад іх ня бачыла. Сяўба ў каапгасе **«Новы шлях»** знаходзіцца ў глыбокім прарыве.

Калгасы, якія ў асноўным скончылі сяўбу («Парыская камуна», Тулава, Мопр) абавязаны арганізаваць буксір адстаючым і скончыць сяўбу. Пралетары Віцебску абавязаны рушыць свае сілы на ліквідацыю гандэбнага адставаньня ў выкачаньні пляну сяўбы на прыгарадных гаспадарках.

Язэп Чорны.

Вопыт дэпутацкай групы „Дынама"

ў барацьбе за вызваленьне савецкай краіны ад тэхніка-эканамічнай залежнасьці--усім дэпутацкім групам фабрык і заводаў БССР

Як змагалася дэпутацкая група заводу „Дынама" за тэхніка-эканамічную незалежнасьць

Тав. Жукаў дэлегат дэпутацкай групы заводу «Дынама» дзеліцца сваім вопытам ў барацьбе за тэхніка-эканамічную незалежнасьць Савецкага Саюзу.

Тав. Жукаў гаворыць:

— Калектыў рабочых заводу «Дынама» налічвае 12 тыс. рабочых, з іх каля 4 тыс. жанчын занятых пераважна ўізаляваных цэхах. Наш завод да 1932 году выпускаў трамвайныя маторы розных тыпаў, электрычныя прылады для асьвятленьня ў цягніках і г. д. Са студзеня 1932 г. завод пераключыўся на больш адказную і складаную работу па выпуску матораў для электравозаў, цеплавозаў, электраляпёдак, электрычных машын, якія абслугоўваюць водны транспарт, і г. д. Апрача гэтага завод зараз выпускае электра-кары (электрычныя цялежкі). Раней-жа гэтыя электра-кары выраблялісь выключна ў Германіі, а зараз мы дасканальна асвоілі выпуск гэтых электра-кар, якімі забясьпечваем усе чыгункі СССР.

Мы зараз выробляем складаныя маторы для Сурамскага перавалу, пад фірмай ДПЭ 340, (у паўтары разы перавышаючыя па велічыні і складанасьці матор тыпу ДП 150). У сакавіку месяцы на завод «Дынама» паступіў з заграніцы шкілет электравоза. Гэты электравоз паступіў для таго, каб мы маглі перазьнець яго і выраблянь свае ўласныя электравозы. У сучасны момант шкілеты гэтых электравозаў выробляюцца ў нашым Саюзе, выпускае іх Каломенскі завод, а завод «Дынама» выробляе для іх маторы, вызваляючы Саюз ад правозу іх з-заграніцы.

Далей тав. Жукаў пераходзіць да зарадженьня той ініцыятывы паходу за тэхніка-эканамічную незалежнасьць, ініцыятарам якога зьявіўся завод «Дынама». Якія моманты прымусілі нашу дэпутацкую групу выпусьціць адозву аб усесаюзным паходзе за вызваленьне нашай краіны ад тэхніка-эканамічнай залежнасьці?

Першы момант—рашэньне XIV партзьезду, які сказаў «весьці наша эканамічнае будаўніцтва так, каб СССР з краіны, якая прывозіць сродкі вытворчасьці, ператварыць у краіну, якая вырабляе сродкі вытворчасьці». Другое—пераход заводу «Дынама» на больш складаную і адказную работу па вырабу матораў для электравозаў, і трэцяе—міжнароднае абвостраньне становішча—пагроза вайны з боку замежнага капіталу Савецкаму Саюзу. Усе гэтыя тры моманты былі пакладзены чамі ў аснову нашай адозвы, якая была падхоплена ўсімі заводамі і фабрыкамі Саюзу.

Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал заводу «Дынама» горача адгукнуўся на нашу адозву. Ён жыва мабілізаваў сябе. Заводакіраўніцтва таксама чутка адносілася да ініцыятывы ўзьнятай нашай дэпутацкай групай. У выніку гэтага на нашым заводзе зараз-жа была складзена асабліва-важная камісія пад старшынствам аднаго выдатнага заслужонага інжынэра нашага заводу для праверкі заявак на імпартнае абсталяваньне і замены імпартнага матар'ялу сваім, савецкім. Усе гэта адбывалася пры непасрэдным удзеле дэпутацкай групы. У выніку гэтага часткі да матору ДП 150, якія прывозіліся з-замежжа, цяпер вырабляюцца намі. Апрача таго да гэтага матору генэратар сконструяваны на нашым заводзе і робіцца ў нас, так што НКШЗ больш з Германіі гэтай машыны не атрымлівае, а карыстаецца выключна нашай прадукцыяй.

Вось яшчэ адзін факт. Да апошняга часу ізаляцыя да матораў прывозілася з Амэрыкі. Цяпер-жа па ініцыятыве дэпутацкай групы вырад гэтай ізаляцыі наладжан на нашым заводзе. Мы цяпер выробляем іскратрывалы матар'ял, на якім мы ашчаджаем 2 тыс. руб. золатам у год. Замена імпартнага азбэставага палатна нашым дае заводу тысячы рублёў эканомі. Намі таксама наладжана тэхнічная вучоба. Інжынэры нашага заводу ў часе якога штодня да 8 тысяч абедаў. Сталоўка не магла задаволіць усіх рабочых і замест гадзічы рабочыя павінны былі прастойваць у чарзе ўвесь свой абедзены перапынак, не пасьпяваючы пабедаць. Дэпутацкая група зьвярнула на гэта ўвагу і зьвярнулася да заводакіраўніцтва з настойлівым патрабаваньнем аб неабходнасьці пашырэньня сталоўкі. У выніку памяшканьне сталоўкі было пашырана за кошт канторы, якая размешчана поруч са сталоўкай. Гэта дало магчымасьць устанавіць больш лік катлоў і рабочыя цяпер маюць магчымасьць пабедаць за 20 хвілін і без чаргі. Мы таксама зьвярнулі ўвагу на палепшаньне якасьці самога абеду. Мы павялічылі самазагатоўкі. У сталоўцы ёсьць нашы дэпутацкія пасты, якія сочаць за якасьцю абеду. Цяпер скарг з боку рабочых значна менш.

Мы вядзем сталы нагляд за заводскім алкормачным пунктам, які зьяўляецца значным рэзэрвам у палепшаньні рабочага харчаваньня. Зараз арганізоўваецца пры заводзе трусатнік, які дасьць дадатковыя мясныя рэзэрвы для забясьпечаньня рабочых мясным абедамі.

У заключэньне тав. Жукаў спыняўся на ўдзеле дэпутацкай групы ў будаўніцтве, якое зараз разгарнулася на заводзе.

Заканчваючы сваю прамову т. Жукаў гаворыць, што ініцыятыва ўзьнятая заводам «Дынама», дала бліскучыя вынікі, аб чым ужо сьведчыць усебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці.

— Маё пажаданьне дэпутацкім групам мэталязаводаў Сав. Беларусі: працавайце і ў далейшым тую герайчную барацьбу за своечасовае выкананьне заказаў для чорнай мэталюргіі, за вызваленьне нашай савецкай краіны ад тэхніка - эканамічнай залежнасьці, — канчае т. Жукаў.

Дэпутацкая група „Камунара" ў першых радох барацьбы за палепшаньне работы прыгараднай гаспадаркі

— Я хачу падзяліцца вопытам работы дэпутацкай групы заводу «Камунар» па яе ўдзелу ў прыгараднай гаспадарцы. Для таго, каб наладзіць работу апошняй, мы на пленуме дэпутацкай групы вылучылі 5 рабочых ударнікаў і паслалі ў прыгарадную гаспадарку для дапамогі правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі. Што зрабіла гэтая брыгада?

У нашай прыгараднай гаспадарцы інвэнтар быў не ў спраўнасьці, а гэта ў сваю чаргу значна тармазіла пасьпяховасьць завяршэньня сяўбы. Пасланая нам брыгада зараз-жа пераключылася на рамонт с.-г. інвэнтара, прыгадуючы яго ў належны выгляд. Ад начасова з гэтым мы дамагліся зьмены кіраўніка гаспадарці, які ня здолеў кіраваць апошняй і паслалі туды нашага лепшага вытрыманага работніка. Але гэтага мала. Прыгарадчая гаспадарка МЦРК, якая перайшла ў веданьне нашага ЗРК, была зусім не падрыхтавана да сяўбы. Плошча, якую займае прыгарадная гаспадарка, добрая, але ня ўгноечая, і раней, чым прыступіць да сяўбы, неабходна было ня добра ўгнаіць. Але не хапала транспарту для вывазкі гною. Дэпутацкая група абгаварыла гэтае пытаньне і дамаглася ад заводакіраўніцтва водпуску значнай часткі заводзкага транспарту для вывазкі гною. Але ўсё-ж транспарту не хапала. Тады дэпутацкая група напісала адкрыты ліст у гарсавет і гарсавет адгукнуўся і даў нам тры машыны, дзякуючы чаму мы здолелі своечасова вывезьці гной, намечаны па пляне.

У выніку нашых стараньняў прыгарадная гаспадарка была поўнасьцю забясьпечана часеньнем.

Гаспадарка мела таксама вялікі недахоп у рабочай сіле. Мы ўзьнялі пытаньне перад парткалектывам і заводакіраўніцтвам аб забясьпечаньні рабочай сілай прыгараднай гаспадаркі. І дабіліся таго, што цэхі па чарзе, выйшлі ў выходныя дні, на работу ў прыгарадную гаспадарцы. Гэтае мерапрыемства забясьпечыла своечасовае сканчэньне сяўбы.

Зараз у нашай прыгараднай гаспадарцы значна ўзрасла колькасьць буйнай рагатай жывёлы. Апрача гэтага наша гаспадарка пачала разводзіць трусоў. Праўда, колькасьць трусоў у нашай гаспадарцы яшчэ невялікая, але ў нас ёсьць поўныя пэрспэктывы, мы пэўны, што ў бліжэйшыя дні чараду трусоў мы давядзем да той нормы, якая вызначана па пляне.

Мы гэтымі днямі адкрываем калгасную краму, прымаем належныя захады, каб распачаць гандаль сельска-гаспадарчымі прадуктамі падшэфных калгасаў.

Мы выпусьцілі сваю насьценную газэту, у якой мы адбіваем усю работу нашай дэпутацкай групы, накіраваную на палепшаньне грамадзкага харчаваньня рабочых і ўзмацненьне барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць. Да гэтага-ж часу нашы матар'ялы друкаваліся ў агульна-заводзкім друку, але трэба адзначыць, што апошні яўна недаацэньвае нашу работу, бо за ўвесь час амаль не зьмясьціў ніводнага радка аб рабоце, якая праводзіцца нашай дэпутацкай групай.

Саўгас імя Лекерта патрабуе арганізаванай дапамогі

Па Менскім саўгасе імя Лекерта сяўба праходзіць вельмі марудна, асабліва па засеве гародніх культур. На 16-6 плян пасеву гародных культур выкананы толькі на 97 проц.: замест 107,5 га засеяна толькі 95 га, раньняй бульбы замест 70 га засеяна 14,75 га. Па палявых культурах таксама ня выкананы пляны; вікі трэба было паводле пляну засеяць да 25 мая 22 га, але на 16-6 засеяча толькі 10,8 га. Сілосныя культуры яшчэ зусім не пачалі засяваць. Галоўнай прычынай прарыву у саўгасе зьяўляецца недахоп рабочай сілы, але і тая рабочая сіла, якая ёсьць у саўгасе, не скарыстоўваецца як належыць. На палявых работах зусім адсутнічае зьдзельшчына. Зараз трэба праводзіць праполку буракоў, рассадку моркві і інш культур, але ўсе вышэйпаданае гаворыць за тое, што і гэты плян пры такіх умовах ня будзе выкананы. У саўгасе ча сёньняшні дзень ня ўсе рабочыя ахоплены вытворчымі брыгадамі: так, на 150 рабочых ёсьць толькі 5 брыгад. У канторы саўгасу працуе 10 чал., але яны ніяк ня могуць справіцца з дакладным улікам працы. Спэцыялісты (саладоўцы і гародніки), скарыстоўваюцца на канторскай рабоце, а на полі іх ніколі ня ўбачыш.

Агульны сход партячэйкі, які адбыўся 7-VI, пастанавіў ліквідаваць прарыў у найкарацейшы тэрмін. Рабочкому трэба весьці растлумачальную работу сярод рабочых па ўвядзеньні зьдзельшчыны і арганізацыі і вытворчых брыгад.

Т.

Ельск паказвае добрыя ўзоры

работы пры пераходзе на брыгадны мэтад у камнябоі і вывазцы

Першая пяцідзёнка дала дрэнныя па казьнікі

Працуд ел трэба максымальна пашырыць

Ня гледзячы на некаторы рост у параўнаньні з першай дэкадай чэрвеня, **першая пяцідзёнка месячніка штурму не дала належнага** эруху ў выкананьні заданьняў па дарожным будаўніцтве, у працугжпавіннасьці.

Па Асіпавіцкім раёне ад 10 да 15 чэрвеня па працугжпавіннасьці вышла на работу замест 5775 па пяцідзённым пляне—41 пешы і замест 4145—249 падвод.

Па Вузьдзенскім раёне за пяцідзёнку працавала 3309 пешых, (замест 1255 вызначаных плянам) і 226 падвод (замест 1860).

Трохі лепш праходзіць выкананьне пляну працугжпавіннасьці **па Пухавіцкім раёне.** За пяцідзёнку чэрвеня па гэтым раёче працавала 958 падвод, пры пляне (ў 3300) і 250 пешых (плян 1560).

Такія марудныя тэмпы выкананьня пляну па працугжпавіннасьці у гэтых раёнах тлумачыцца недастатковым разгортваньнем растлумачальна-масавай работы сярод сельскага працоўнага насельніцтва і адсутнічаньнем належнага кіраўніцтва гэтай справай з боку РВК і раённых і сельскіх арганізацый.

Чэрвень месяц зьяўляецца рашаючым у правядзеньні працугжпавіннасьці.

Зараз жа неабходна разгарнуць шырокую растлумачальна-масавую работу і папулярызацыю пастаноў ЦВК і СНК БССР аб працудзеле ў дарожнім будаўніцтве.

Тэмпы выхаду на работу па працугжпавіннасьці быць неадкладна і пашуча ўзьняты. Гэта павінны ўлічыць усе арганізацыі, асабліва **Вузьдзенская** і **Асіпавіцкага** раёнаў, якія цягнуцца ў хвасьце.

Брыгада «Савецкай Беларусі»:
Р. Іжок, С. Громаў, Дудар, Багун, Касьцюк, Кашкель, Грын.

Узорныя вынікі ўдарнай работы Прадукцыйнасьць працы павышана на 100 проц.

ЕЛЬСК. (Наш кар.). 11-га чэрвеня ад былася нарада райпартактыву па пытаньні дарожнага будаўніцтва.

Для арганізацыйна масавай работы у сельсаветы камандыраваны ўпаўнаважаныя РК КП(б)Б і выехала выездная рэдакцыя газэты **«Бальшавіцкі Змагар».** Былі праведзены сходы, па седжаньні праўленьняў калгасаў.

У **Санюкоўскім** сельсавеце 13-га чэрвеня складзены спэцыяльны штаб штурму прарываў у дарбудаўніцтве.

Выязная рэдакцыя паставіла сваёй задачай праз разгортваньне работы на завога друку мабілізаваць усю працоўную масу на дарбудаўніцтва, ствараючы ўдарныя брыгады.

13-га чэрвеня было арганізавана такіх брыгад па падвозцы камня—5.

Першаю была створана брыгада тав. **Назарэнка Я.** з 8 асоб—беднякоў в. Санюкоў. Брыгада арганізавалася ў часе самой работы пры пагрузцы камня. Яна паставіла перад сабой задачу падняць прадукцыйнасьць працы. Тут жа была створана брыгадная газэта **«На штурм».** Брыгада абвесьціла сябе ўдарнай, паставіла перад сабой задачу рабіць пры падвозцы камня замест звычайнага 1-га рэйса—2 рэйса пры поўным захаваньні коняй.

Брыгада з пастаўленымі задачамі справілася поўнасьцю і праз сваю што дзённку выклікала ўсіх рабочых арганізаваць новыя ўдарныя брыгады. У адказ на гэты выклік зараз-жа арганізаваліся яшчэ 4 брыгады, ў якіх таксама пачаўся выпуск брыгадных што дзенак.

Брыгадзір 3й брыгады т. **Назарчук Кандрат** кажа: **«мы прыстасуем тут на дарбудаўніцтве мэтады работ лесараспрацовак. Мы з задачамі дарбудаўніцтва справімся і выканаем пляны да тэрмінова».**

Практыка ўзорнай работы брыгады т. **Назарэнка Я.** паказала, што прадукцыйнасьць працы пры пераходзе на работу брыгадаю ў кожнага рабочага па высіліся на 100 прац. Павысілася на 100 проц. і прадукцыйнасьць працы возчыкаў.

Герасіменка.

Улічыць недахопы першых суботнікаў

Галоўнае—сваячасовая падрыхтаванасьць

Ліквідацыя прарываў ў дарожным будаўніцтве патрэбуе канкрэтнай дапамогі з боку нашай працоўнай грамадзкасьці. Адзнай з форм такой дапамогі зьяўляецца масавыя суботнікі на дарожным будаўніцтве. Але гэтыя суботнікі могуць прынесьці палрэбную карысьць, могуць сябе апраўдаць толькі пры ўмове правільнай арганізацыі і чоткага іх правядзеньня.

Рабочыя і служачыя раду прадпрыемстваў і устаноў пралетарскіх цэнтраў, улічваючы вялізарнае народна-гаспадарчае ўмацаваньне дарожнага будаўніцтва, жыва адгукнуліся на прапаноку перадавікоў аб арганізацыі суботнікаў. Штодзённа сотні чалавек выходзяць у свае выходныя дні на дарогу, каб дапамагчы ліквідаваць прарыў.

Адчак, у радзе выпадкаў, з прычыны неарганізаванасьці ў прыёмкі і расстаноўкі гэтай рабочай сілы, на **вучастках і лініі суботнікі праходзяць вельмі дрэнна** і не апраўдваюць зробленых на іх выдаткаў.

Такія факты наглядаюцца на 5 дарбудвучастку. 15 чэрвеня па лініі прараба № 1 прыбыла з Менску на суботнік 300 чал. Для перавозкі іх з Менску на месца работ з лініі **былі зьняты 9 аўтамашын.** Але калі людзі прыехалі на вучастак, аказалася што да прыёмкі іх амаль нічога ня было падрыхтавана. Тэхнэрсанчлые падрыхтаваўся да кіраўніцтва працэдзеньнем суботніка, людзі расстаўляліся, як прыдзецца, не арганізавана.

У выніку—суботнік пачаўся толькі а 1 гадзіне дня а ў 5 гадзін узьдзельнікі суботніка чакіраваліся назад ў Менск. Такім чынам гэты суботнік сябе не апраўдаў, бо людзі заробілі менш чым маглі зарабіць 9 аўтамашын адарваных ад работы.

Такія зьявішчы ні ў якім выпадку не павінны паўтарацца.

Вурокі першых суботнікаў павінны быць улічаны пры далейшай арганізацыі грамадзкай дапамогі ў штурме прарыву ў дарбудаўніцтве. **Дарожныя арганізацыі адказваюць за правільнае правядзеньне суботнікаў,** за рацыянальнае скарыстаньне рабочай сілы.

Гэтаму павінны садзейнічаць сваечасовае паведамленьне прарабаў аб накіраваньні на іх вучасткі рабочай сілы, дакладны ўлік колькасьці ўдзельнікаў суботнікаў і ўсебаковая падрыхтоўка (тэхнічнае кіраўніцтва, інструманты, харчаваньне і г. д.).

Выязная рэдакцыя «Савецкай Беларусі».

Правільна расставіць сілы

Разгарнуць работу па ўсіх вучастках

КРУПКІ. Дрожнае будаўніцтва ў Крупскім раёне на ўсіх вучастках яшчэ не разгарнулася як гэта трэба. Па сельсаветах хоць і абвешчаны месячнік штурму прарываў дарожнага будаўніцтва, але работы па гэтай справе не вядзецца, не вядзецца і ніякай растлумачальнай работы.

З свайго боку райком партыі і дарожны інспэктар РВК не мабілізавалі амаль нікога на месцы ў сельсаветы, каб сапраўды разгарнуць там работу.

Ужо цэлы рад калгасаў і вёсак закончыў веснавую сяўбу і можна было-б ужо ўсю рабочую сілу мабілізаваць на штурм бездарожжа, але да апошняга часу работа па ўсіх сельсаветах раёну не разгорнута.

Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі ня ведаюць аб тым, што зараз праходзіць ударны месячнік штурму. Надалей гэтыя зьявішчы патрэбна ў самым корані зьнішчыць.

Толькі на адным вучастку дарбудаўніцтва работа ідзе бальшавіцкімі тэмпамі—гэта на шашы. Работа тут пачалася яшчэ ў красавіку месяцы і ідзе брыгаднымі мэтадамі, па-ўдарнаму. Тут **брыгада вырашае посьпехі ва ўсіх галінах работы.** Паміж усімі рабочымі па будаўніцтву шашы, **шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.**

Крупскі РВК і раённыя арганізацыі абавязаны правільна расставіць усе дарожныя тэхнічныя сілы на ўсіх вучастках работы і месячнік штурму ператварыць у сапраўды ўдарную справу.

А. Вясковы.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Новая правакацыя белабандытаў у Харбіне

Пахішчэньне камэрсанта Кофмана бандай золатапагоньнікаў—повад для антысавецкай кампаніі

ХАБАРАЎСК. 15-6. (Уласная інфармацыя «Правды»). У Харбінскай прэсе ў апошнія дні падняты вялізны шум па прычыне пахішчэньня бандытамі некага харбінскага камэрсанта МІРОНА УЛАДЗІМІРАВА КОФМАНА. Газэты паведамляюць, што бандыты зьвярнулі ся з пагрозай да крэўных Кофмана, патрабуючы выкупу.

Пахішчэньне багатага чалавека з мэтай шантажу, асабліва ў Харбіне, перапоўненым белабандытамі, прахадзімцамі і ўсякага роду людзкім ахвосьцем, не прадстаўляла-б нічога дзіўнага, калі-б яно не было выкарыстана ў якасьці повада для новай падлейшай антысавецкай кампаніі.

Як аказваецца КРЭЎНЫЯ КОФМАНА (магчыма ўспомніўшы справу Лінд берга ў ПАЗШ), адчаяўшыся, як відаць, у атрыманьні дапамогі ад мясцовай паліцыі, ДАЛІ ВЫКУП У РАЗЬМЕРЫ 30 ТЫСЯЧ КІТАЙСКІХ ДОЛАРАЎ ЖОНЦЫ ВЯДОМАГА БЕЛАГВАРДЗЕЙЦА ПАЛКОЎНІКА КЛЮКАНОВА, ЯКІ Ў СВАЮ ЧАРГУ, ПЕРАДАЎ ГЭТЫЯ ГРОШЫ ГЕНЭРАЛУ КОСЬМІНУ.

Злоўленых, такім чынам, з «палічным», харбінская паліцыя вымушана была арыштаваць, ня гледзячы на тое, што некаторыя з іх займалі, як аказваецца, «афіцыяльныя пасты». Так, арыштаваны за ўдзел у пахішчэньні капітан САРОКІН—фашыст, белагвардзеец і член небязьведамага «брацтва рускай праўды»,—служыў у якасьці ка мандзіра атраду, набранага японскай уладай для аховы Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі. На сваю высокую пасаду белагвардзеец Сарокін папаў па рэкамэндацыі другога ня менш «адказнага» белабандыта палкоўніка Клюканова, які ў свой час намячаўся на пасаду камандзіра белага батальёну.

САРОКІН і КЛЮКАНОЎ у мінулым БЫЛІ ПАД АРЫШТАМ у сувязі са справай белагвардзейца УШАКОВА. Як вядома, белагвардзеец Ушакоў быў арыштаваны кітайскай уладай на ст. Манчжурыя, пры чым у яго былі знойдзены дакументы Харбінскай ваеннай місіі. Пры дапросе ён заявіў, што зьяўляецца членам «актыўнай групы амурскага казацтва» і пасланы для дывэрсыйных актаў на КУЧ і тэрарыстычных дзеяньняў супроць СССР.

У сувязі з гэтым чакалася апублікаваньне адпаведных дакументаў. Але японская ўлада, каб зьбегнуць скандалу, патрабавала ад Чжан-Цзін-Гуя із'яць справу з суда.

Адзін з галоўных віноўнікаў пахішчэньня—памянёны вышэй—ГЕНЭРАЛ КОСЬМІН. Апошні зьяўляецца правадыром фашысцкіх арганізацый у Харбіне, членам мілераўскага «общественного союза» і атаманам «братства русской правды». Косьмін—актыўны белагвардзеец, фармуе белагвардзейскія атрады для вайны супроць Савецкага Саюзу.

Белагвардзейцы Сарокіны, Клюкановы і Косьміны адкрыта падрыхтоўвалі вайну супроць СССР, шукаючы ўдобнага повада для правакаваньня яе.

Харбінскае пахішчэньне—чарговая форма брудная правакацыі белабандытаў. Фабрыкацыя фальшывак, забойствы іностранных дзеячоў аказваюцца недастатковымі. Адкак, гэтая новая правакацыя, зробленая, як і папярэднія, недастаткова чыста, праваліласяпаставіўшы толькі ў нялоўкае становішча японскую ўладу.

Харбінскі вышукны аддзел, жадаючы выгарадзіць з гэтай справы сябе і белабандытаў вышукае спосабы абвініць у пахішчэньні Кофмана... Савецкае консульства. З гэтаю мэтаю пушчаны слух аб тым, быццам арыштаваныя зьяўляюцца савецкімі агентамі, з дапамогаю якіх консульства СССР на меравалася справакаваць белагвардзейцаў, абвінаваціўшы іх у пахішчэньні.

Лаўры францускай паліцыі ад спроб перавярненьня белабандыта Гаргулова ў «савецкага агента», як відаць, не даюць спакою манчжурскім белагвардзейскім правакатарам.

„Антыяпонскі байкот не павінен зьмякчацца"

Заява прадстаўніка нанкінскага ўраду

НАНКІН. 17-VI. Агенцтва **«Цэнтраль Ньюс Эджэнон»** паведамляе аб наступнай заяве прадстаўніка нанкінскага ўраду, якая была ім зроблена ў Нанкіне.

«У выпадку, калі нацыя адмовіцца ад супраціўленьня да канца японскай агрэсіі, дык мы ня толькі ня зможам вярнуць Манчжурыю, але і ўся краіна будзе страчана. Кітайскі народ не павінен ні на мінуту зьмякчаць антыяпонскі байкот, які наносіць цяжкія ўдары эканамічнаму жыцьцю Японіі. Аднак, справаздачы аб японскім гандлі за май гэтага году паказваюць актыўны балянс на карысьць Японіі ў суме звыш 10 млн. іен. Гэта азначае, што пасьля некалькіх месяцаў барацьбы Японія зноў аправілася. У той-жа час гэта паказвае сумнае паслабленьне байкоту.

Калі япона-кітайскі канфлікт можа быць урэгуляваны дыплёматычным шляхам, дык гэта будзе зьдзейснена або праз пасярэдніцтва Лігі нацый, або непасрэднымі перагаворамі пры дапамозе Лігі нацый (дзяржавы ніколі ня будуць патрабаваць зьмены 16 параграфу статуту Лігі нацый).

Непасрэдныя перагаворы будуць заначаць, што Кітаю будуць навязаны немагчымыя ўмовы, як пераможанай краіне. Таму адзіным шляхам зьяўляецца мабілізацыя ўсёй нацыі для таго, каб прынесьці ў ахвяру нават чалавечае жыцьцё, калі ў гэтым зьявіцца неабходнасьць».

Напярэдадні ўсеагульнай забастоўкі тэкстыльшчыкаў у Польшчы

ВАРШАВА. 17-VI. На нарадах рабочых дэлегатаў тэкстыльшчыкаў Лодзі большасьць выказалася супроць сацыял-фашысцкага кіраўніцтва. Пастаноўлена стварыць рабочы забастовачны камітэт. Яму даручана неадклад на абвясьціць усеагульную забастоўку тэкстыльшчыкаў. У тую-ж ноч, зараз-жа пасьля канфэрэнцыі, камітэт дзейнасьці зьняў з працы ўсіх рабочых начной зьмены.

Тэкстыльшчыкі Беластоку, Бельску, і Тамашова заявілі аб сваёй гатоўнасьці неадкладна далучыцца да забастоўкі. Сацыял-фашысцкія прафсаюзы заявілі, што «зьнімаюць з сябе адказнасьць за гэтую забастоўку».

Газэты пішуць, што кіраўніцтва барацьбой тэкстыльшчыкаў у руках камуністаў.

Надзвычайныя дэкрэты ў дзеяньні

БЭРЛІН. 17-VI. На канфэрэнцыі ў міністра ўнутраных спраў **Гайля,** прадстаўнікі правінцый выказалі небясьпеку, зьвязаную з новым дэкрэтам.

Гайль катэгарычна заявіў, што ўрад гатовы да неадкладнага ўмяшаньня, калі ў якой-небудзь частцы краіны ўзьнікнуць труднасьці пры правядзеньні дэкрэту, тым больш, што дэкрэт дае міністру ўнутраных спраў паўнамоцтвы разьбіраць скаргі правінцыяльных урадаў, прымаючы меры да ўрэгуляваньня канфліктаў.

Баварскі ўрад пакідае ў моцы свой дэкрэт аб забароне ўсіх дэманстрацый і апроч таго выдаў новы дэкрэт, які падцьвярджае забарону нашэньня якой-бы то ні было партыйнай формы. Учора ў баварскім ляндтагу адбылася бурная сутычка паміж нацыянал-сацыялістычнымі дэпутатамі (якія, ня гледзячы на забарону, зьявіліся на паседжаньне ў сваёй новай форме) і паліцыяй. Паліцыя вывела нацыянал-сацыялістычных дэпутатаў з ляндтагу і ачысьціла трыбуны ад апранутых у форму нацыянал-сацыялістаў.

Паводле паведамленьня газэт, за апошнія дні па ўсёй краіне адбываюцца правакуемыя штурмавікамі сутычкі з рэвалюцыйнымі рабочымі.

Пра абавязковае акладнае страхаваньне ў сельскіх мясцовасьцях і гарадох БССР на 1933 год

ПАСТАНОВА ЭКАНАМІЧНАГА САВЕТУ БССР

У адпаведнасьці з пастановаю Савету Працы і Абароны за 10 чэрвеня 1932 г. „Пра абавязковае акладнае страхаваньне ў сельскіх мясцовасьцях і гарадох на 1933 год" (Апублік. у газэце „Известия ЦИК СССР и ВЦИК" за 1932 г. № 163), Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць, што ў калгасах (сельскагаспадарчых камунах, сельскагаспадарчых арцелях і таварыствах супольнай апрацоўкі зямлі) павінен абавязкова страхавацца наступны сельскагаспадарчы інвэнтар: трактары, плугі розных сыстэм, граблі конныя, бароны трактарныя і конныя (дыскавыя, спружынныя, зыг-загі), сеялкі розных сыстэм, бульбасажалкі, зернаачысьцілкі (веялкі, сартыроўкі, трыеры), складаныя і простыя малатарні, жнейкі, касілкі, снапавязалкі, бульбакапалкі, льнопрадзілкі, льномялкі, прасавальныя машыны, сэлмарэзкі, сіласарэзкі, сэпаратары, маслабойкі, лёкамабілі і інш. механічныя рухавікі, а таксама мэханізаваны транспарт—аўтамабілі і матацыклы.

2. Па страхаваньні сельскагаспадарчых жывёлы і сельскагаспадарчых расьлін устанавіць наступныя цьвёрдыя нормы страхавога забясьпечаньня для сельскіх мясцовасьцяй і гарадоў БССР:

Віды страхаваньня.	Нормы страхавога забясьпечаньня: Калгасы	Калгасьнікі і аднаасоб.
Па страхаваньні жывёлы	Норма на адну штуку	
а) буйнай рагатай жывёлы ад 1 году да 2-х гадоў	50 р.	40 р
б) буйнай рагатай жывёлы ад 2 гадоў і старэй	100 р.	80 р.
в) коняй ад 2-х гадоў	75 р.	65 р.
г) сьвіней ад 6 месяцаў	50 р.	—
д) авец і коз ад 6 месяцаў	20 р	—
Па страхаваньні сельскагаспадарчых расьлін.	Норма на адзін га:	
а) збожжавых і бабовых расьлін, сеяных траў і сілосных культур	50 р.	45 р.
б) бульбы, кораньплодаў і тэхнічных культур, апроч лёну, канапель і махоркі	150 р.	125 р.
в) гародаў і садоў	400 р	325 р.
г) лёну:	Граничныя нормы адказнасьці на 1 га у цэнт.	
у льномалочных раёнах:		
саломы сухой	16,5	13,2
семя	2,5	2,2
у іншых раёнах:		
саломы сухой	15,0	12,0
семя	2,5	2,0
д) канапель ва ўсіх раёнах.		
саломы сухой	25,0	20,0
семя	4,2	3,4
е) махорка	9,0	8,0

3. Страхавыя плацяжы для паасобных раёнаў і гарадоў уст навіць у наступныя разьмерах:

А. У сельскіх мясцовасьцях.

Род маемасьці	Разьмер страхавога плацяжу для раёнаў: I група	II групы	III групы	IУ групы
I. За будынкі, сельска-гаспадарчыя і прамысловыя прадпрыемствы (з абсталяваньнем), а ў калгасах, апроч таго, за сельска-гаспадарчы інвэнтар і мэханізаваны т, анспарт са 100 руб. страхавога забясьпечаньня:				
Для калгасаў	55 к.	60 к.	65 к.	75 к.
„ калгасьнікаў	1 р. 10 „	1 р. 20 „	1 р. 30 к.	1 р. 50 „
„ аднаасобных працоўных гаспадар.	1 „ 80 „	1 „ 40 „	1 „ 55 „	1 „ 80 „
II. За жывёлу:				
1. Тарыфныя стаўкі				
Для калгасаў:				
За буйную рагатую жывёлу	2,30 %	2,35 %	2,60 %	2,95 %
„ коняй	3,70 „	3,80 „	4,20 „	4,65 „
„ сьвіней, авец і коз	5,30 „	5,40 „	6,00 „	6,80 „
Для калгасьнікаў і аднаасобных працоўных гаспадарак:				
За буйную рагатую жывёлу	3,70 „	3,80 „	4,20 „	4,75 „
Для аднаасобных працоўных гаспадарак:				
За коняй	6,85 „	6,50 „	7,20 „	7,95 „
2. Плацяжы за 1 штуку				
Для калгасаў:				
За буйную рагатую жывёлу ад 1 году да 2-х гадоў	1 р. 15 к.	1 р. 18 к.	1 р. 30 к.	1 р. 48 к.
За буйную рагатую жывёлу ад 2 гадоў і старэй	2 „ 30 „	2 „ 35 „	2 „ 60 „	2 „ 95 „
За коняй	2 „ 78 „	2 „ 85 „	3 „ 15 „	3 „ 49 „
За сьвіней	2 „ 65 „	2 „ 70 „	3 „ — „	3 „ 40 „
За авец і коз	1 „ 06 „	1 „ 08 „	1 „ 20 „	1 „ 36 „
Для калгасьнікаў і аднаасобных працоўных гаспадарак:				
За буйную рагатую жывёлу ад 1 году да 2-х гадоў	1 „ 48 „	1 „ 52 „	1 „ 68 „	1 „ 90 „
За буйную рагатую жывёлу ад 2 гадоў і старэй	2 „ 96 „	3 „ 04 „	3 „ 36 „	3 „ 80 „
Для аднаасобных працоўных гаспадарак:				
За коняй	4 „ 13 „	4 „ 23 „	4 „ 68 „	5 „ 17 „
III. За сельскагаспадарчыя расьліны				
1. Тарыфныя стаўкі:				
Для калгасаў				
За ўсе пасевы, апроч лёну, канапель і махоркі	2,90 %	2,95 %	3,30 %	3,60 %
За лён: у льно-малочн раёнах	2,40 „	2,45 „	2,70 „	2,95 „
„ „ іншых раёнах	2,80 „	2,90 „	3,20 „	3,50 „
За каноплі	2,60 „	2,65 „	2,95 „	3,20 „
За махорку	2,90 „	2,95 „	3,30 „	3,60 „
За сады	0,85 „	0,90 „	1,00 „	1,10 „
Для калгасьнікаў і аднаасобных працоўных гаспадарак:				
За ўсе пасевы, апроч лёну, канапель, махорки і гародаў	5,40 „	5,55 „	6,15 „	6,70 „
За лён: у льно-малочных раёнах	4,60 „	4,70 „	5,20 „	5,70 „
у іншых раёнах	5,10 „	5,25 „	5,80 „	6,35 „
За каноплі	4,85 „	4,95 „	5,50 „	6,00 „
За махорку	4,20 „	4,30 „	4,80 „	5,25 „
За гароды і сады	1,70 „	1,80 „	2,00 „	2,20 „
2. Плацяжы за 1 га пасеваў для калгасаў				
За збожжавыя і бабовыя расьліны, сеяныя травы і сілосныя культуры	1 р. 45 к.	1 р. 48 к.	1 р. 65 к.	1 р. 80 к.
За бульбу, кораньплоды і тэхнічныя культуры, апроч лёну, канапель і махоркі	4 „ 35 „	4 „ 43 „	4 „ 95 „	5 „ 40 „
За лён на ўсіх раёнах	3 „ 24 „	3 „ 31 „	3 „ 65 „	3 „ 98 „
а каноплі	5 „ 07 „	5 „ 17 „	5 „ 75 „	6 „ 24 „
За махорку	8 „ 27 „	8 „ 41 „	9 „ 41 „	10 „ 26 „
За гароды	11 „ 50 „	11 „ 80 „	13 „ 20 „	14 „ 40 „
За сады	3 „ 40 „	3 „ 50 „	4 „ 00 „	4 „ 40 „
Для калгасьнікаў і аднаасобных працоўных гаспадарак				
За збожжавыя і бабовыя расьліны, сеяныя травы і сілосныя культуры	2 „ 43 „	2 „ 50 „	2 „ 77 „	3 „ 02 „
За бульбу і тэхнічныя культуры, апроч лёну, канапель і махоркі	6 „ 75 „	6 „ 94 „	7 „ 69 „	8 „ 38 „
За лён ва ўсіх раёнах	4 „ 83 „	4 „ 94 „	5 „ 46 „	5 „ 99 „
За каноплі	7 „ 52 „	7 „ 67 „	8 „ 53 „	9 „ 30 „
За махорку	10 „ 50 „	10 „ 75 „	12 „ 00 „	13 „ 13 „
За гароды і сады	5 „ 53 „	5 „ 85 „	6 „ 50 „	7 „ 15 „
IV. Для кулацкіх гаспадарак, якія абкладаюцца сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, і асоб, якія абкладаюцца падаходным падаткам па росьпісу № 3				
Па страхаваньні будынкаў, прамысловых прадпрыемстваў (з абсталяваньнем), жывёлы і сельска-гаспадарчых расьлін, апроч лёну і канапель, устаноўленыя для аднаасобных працоўных гаспадарак, стаўкі страхавых плацяжоў павялічваюцца ў тры разы				
Па страхаваньні лёну і канапель устанавіць наступныя плацяжы на 1 га пасеваў:				
За лён ва ўсіх раёнах	22 „ 41 „	22 „ 92 „	25 „ 38 „	27 „ 82 „
За каноплі	34 „ 84 „	35 „ 57 „	19 „ 54 „	43 „ 17 „

В. У ГАРАДОХ

За будынкі, сельска-гаспадарчыя і прамысловыя прадпрыемствы (з абсталяваньнем), а ў калгасах, апроч таго, за сельска-гаспадарчы інвэнтар і мэханізаваны транспарт са 100 рублёў страхавога забясьпечаньня:

	Менск, Гомель	Бабруйск, Магілёў	Віцебск	30 іншых гарадоў
Для калгасаў ва ўсіх гарадох				
Для калгасьнікаў і працоўнага насельніцтва	90 к.	75 к.	—	60 к
Па страхаваньні коняй у працоўнага насельніцтва:				
Тарыфная стаўка	11 проц.	10 проц.	8,2 проц.	
Плацеж за 1 штуку	7 р. 15 к.	6 р. 50 к.	5 р. 33 к.	

Па страхаванні сельскагаспадарчых расьлін і буйнай рагатай жывёлы ў калгасах, калгасьнікаў і аднаасобных гаспадарак, а таксама па страхаваньні коняй, сьвіней, авец і коз у калгасах бяруцца плацяжы, устаноўленыя для адпаведных сельскіх раёнаў.

4. Да паказаных у арт. 3 груп раёнаў адвесьці наступныя раёны:

I група: Асьвейскі, Бягомльскі, Дрысенскі, Жыткавіцкі. Койданаўскі, Лельчыцкі. Лепельскі, Мазырскі, Плешчаніцкі, Полацкі, Слуцкі і Вушацкі.

II-я група: Заслаўскі, Капыльскі, Лагойскі, Любаньскі, Пятрыкоўскі, Расонскі, Старобінскі, Тураўскі, Вузьдзенскі і Чырвона-Слабодзкі.

III-я група: Асіпавіцкі, Бешанковіцкі, Буда-Кашалёўскі, Бялыніцкі, Бярэзінскі, Гарадоцкі, Глускі, Горацкі, Дубровенскі, Ельскі, Камарынскі, Кармянскі, Касьцюковіцкі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Чырвонапольскі, Крупскі, Лоеўскі, Нараўлянскі Парыцкі, Прапойскі, Сеньненскі, Сіроцінскі, Стара-Дароскі, Сураскі, Талачынскі, Уваравіцкі, Хойніцкі Церахаўскі, Чавускі, Чашніцкі Чічэрскі, Чэрыкаўскі і Чэрвеньскі.

IV-я група: Аршанскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Брагінскі, Быхаўскі, Веткаўск, Віцебскі, Гомельскі, Жлобінскі, Крычаўскі, Лезьненскі, Магілёўскі, Менскі Мсьціслаўскі, Пухавіцкі, Рагачоўскі, Рэчыцкі, Смалявіцкі і Шклоўскі.

5. Устанавіць наступныя тэрміны для уносу страхавых плацяжоў.

	Для калгасаў	Для калгасьнікаў і аднаасобных працоўных гаспадарак	Для кулацкіх гаспадарак, якія абкладаюцца сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку і асоб, якія абкладаюцца падаходным падаткам па раскладу №3
У сельскіх мясцовасьцях:	Да 15 верасьня 1932 г. 30 проц. акладу	Да 1 верасьня 1932 г. 30 проц. акладу	Да 1 жніўня 1932 г. 100 проц. акладу.
	Да 15 кастрычніка 40 проц акладу	Да 15 кастрычніка 50 проц. акладу	
	Да 1 сьнежня 30 проц. акладу	Да 1 сьнежня 20 проц. акладу	
У гарадох	Да 15 верасьня 1932 г. 50 проц. акладу Да 1 лістапада 50 проц. акладу	Да 15 кастычніка 1932 году—100 проц. акладу	Да 1 жніўня 1932 г 100 проц. акладу

6. З 10 проц. адлічэньня ад агульнай сумы паступіўшых акладных страхавых плацяжоў перадаць на выдаткі па папярэджаньні і змаганьні з пажарамі, павод камі і сьмяротнасьцю жывёлы:

	У бюджэты сельскіх саветаў	У бюджэты гарадзкіх саветаў	У бюджэты РКВ, Менскага, Віцебскага і Гомельскага гарсавету
Па сельскіх мясцовасьцях	Ня менш 26 проц.	—	Ня больш 75 проц.
Па гарадох..			
Віцебску, Гомелю і Менску	—	—	100 проц.
Па іншых гарадох	—	Ня менш 50 проц.	Ня больш 50 проц.

7. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, гарадзкім і сельскім саветам неадкладна разгарнуць шырокую агітацыйна-растлумачальную кампанію па папулярызацыі новага закону пра абавязковае акладное страхаваньне на 1933 г. асабліва растлумачыць ільготы устаноўленыя для калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных незаможных і серадняцкіх гаспадарак.

Старшыня СНК і эканамічнага савету БССР **М. Галадзед**

Краўнік спраў Савету народных камісараў і Эканамічнага савету БССР **С. Кандыбовіч**

17 чэрвеня 1932 г., гор. Менск.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТ. „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	СЫН МАЭСТРО
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	Амэрыканскі фільм Бізун наглядчыка
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	„КАЛАМУТА"

Беларускі Дзяржаўны Інстытут Буйнай Рагатай Жывёлы (у Горках)

АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ студэнтаў на 1-ы КУРС

аддзяленьняў інстытуту: 1) Буйнай рагатай жывёлы, 2) Эканомікі і плянаваньня, 3) Малочнай гаспадаркі.

Заявы прымаюцца да 10 верасьня. Іспыты з 10 па 20 верасьня

Заняткі пачнуцца 1-га кастрычніка

Заявы, з паказаньнем аддзяленьня, падаваць на наступны адрас: Інстытут буйнай рагатай жывёлы, гор. Горкі, БССР

Да заявы прыкласьці наступныя дакументы: засьведчаную анкету аб адукацыі, аб сан. і матэрыяльным становішчы паступаючага і бацькоў, узросьце, вайсковай павіннасьці, здароўі, мэтрыка, 3 фотакарткі і марак на 30 кап.

Дырэкцыя інстытуту

Барысаўская Лесаэксплёатацыйная Школа

АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР у ліку 245 асоб

1. **На лесаэксплёатацыйнае** аддзяленьне прымаюцца: з ведамі 7-годкі—70 асоб, з ведамі 6-годкі—35 асоб і з ведамі 5-годкі—35 асоб.

2. **На лесасплаўнае** аддзяленьне прымаюцца: з ведамі 7-годкі—70 асоб з ведамі 6 годкі—35 асоб.

Узрост паступаючых ад 15 да 35 год, усе прынятыя ў школу забясьпечваюцца стыпэндыямі ад 29 да 63 руб. і інтэрнатам. Тэрмін падачы дакумантаў да 15 жніўня г. г.

Для паступленьня неабходна прадставіць наступныя дакументы: аб асьвеце, аб сацыяльным становішчы, аб стане здароўя, аб узросьце і засьведчаную анкету.

ДЫРЭКЦЫЯ

Смалявіцкае Аддзяленьне Дзяржбанку

даводзіць да ведама ўсіх інагародніх пастаўшчыкоў тавару, што Торфрабкоп „Чырвоны сьцяг", Смалявіцкага раёну, зьяўляецца неакуратным і неплацёжаздольным платнікам па рахунках-фактурах пастаўшчыкоў.

ЁСЬЦЬ ШМАТ НЕАПЛАЧАНЫХ РАХУНКАЎ

Аддзяленьне банку **рэкамэндуе** пастаўшчыкам **адгружаць** тавары **супроць акрэдытыву** ці рабіць адзваку ў чыгуначнай накладной, што **разьлік за груз вытвараецца праз банк у парадку акцэпту**

Смалявіцкае Адз. Дзяржбанку

Друкарня імя Сталіна.